...ная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯ...

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 29 1933 г. СЕРАДА № 263 (4807)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СКВА Ст. Площадь 4 Оргинструкторск. (Зв.1)

Адкрыўся 1-шы Ўсебеларускі комсамольска-маладзёжны злёт ударнікаў абароны

28 лістапада ў будынку Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра адкрыўся першы ўсебеларускі комсамольска-маладзёжны злёт ударнікоў вытворчасці і абароннай работы.

Лепшыя ўдарнікі комсамола і пролетарскай моладзі сабраліся для таго, каб падвесці вынікі абароннай работы, абмяняцца лепшым вопытам і формамі і вызначыць далейшыя задачы.

Злёт адкрыў сакратар ЦК ЛКСМБ тав. ГЕРЦОВІЧ. Уступная прамова тав. Герцовіча не раз перарывалася гучнымі апладысментамі.

Ганаровымі делегатамі злёта выбраны т. т. БАРАШЫЛАЎ, КОСАРАЎ, ЭЙДЭМАН і ГІКАЛО. Ганаровым старшынёй злёта выбран т. КОСАРАЎ.

Членамі ганаровага прэзідыума пад гучныя апладысменты выбраны т. т. СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, КАЛІНІН, ВАРАШЫЛАЎ, ОРДЖАНІКІДЗЕ, КУЙБЫШАЎ, КІРАЎ, КАСІОР, РУДЗУТАК, АНДРЭЕЎ ПОСТЫШАЎ, ГІКАЛО, КОСАРАЎ, ЧЭМАДАНАЎ, ЭЙДЭМАН, ТЭЛЬМАН, ТОРГЛЕР, ДЗІМІТРАЎ, ЛЫЧОЎ, ГАЛАДЗЕД, САХАРАВА, ЛЕНСКІ.

У прэзідыум злёт выбраў т. т. ШАРАНГОВІЧА, ЖЭБРОЎСКАГА, РЫОКІНА, ГЕРЦОВІЧА, ГАЛАДЗЕДА, ЗАКОЎСКАГА, АЎГУСТАЙЦІСА, ГУБАРЭВІЧА, ДУБІНУ, КАВАЛЬЧУКА, БРАГІНСКАГА, у поўным складзе делегацыю ад Бауманскага раёна (Масква), а таксама ад падшэфнага пікера «Парыжская комуна» т. РЭМЕЛЯ і інш.

Пасля выбараў кіруючых органаў злёта з дакладам аб міжнародным становішчы і задачах абароннай работы выступіў сакратар ЦК КП(б)Б т. ШАРАНГОВІЧ. З'яўленне т. Шаранговіча на трыбуне злёт сустракаў бурнымі апладысментамі.

ЛЕНІНСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА ПЕРАМАГАЕ

Адным з важнейшых поспехаў, з якімі прыходзіць наша партыя да 17 з'езда, з'яўляецца найвялікшая перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі. Нехалі яшчэ ня быў так пільна-ўважны сакрэтарыят росквіт, бурны рост на прыгнечаных совецкіх рэспубліках. Калісьці адсталыя, прыгнечаныя царызмам і капіталізмам нацыянальнасці сёння высоўваюцца ў рады перадавых будаўнікоў соцыялістычнага грамадства.

За гады пяцігодкі створаны магутныя прамысловыя ачагі ў нацыянальных рэспубліках, ажыццяўляецца новае размяшчэнне прадукцыйных сіл. Украіна ўзбагачаецца тавамі цэлымі сучаснай тэхнікі, як Днепрабуд, як Харкаўскі трактарны, Харкаўскі турбінны, Краматорскі і іншыя заводы; аживіўся тавар старога Данбаса, які з Данбаса «простых зямляносцаў» ператвараўся ў сістэму прадпрыемстваў, узброеных навейшымі механізмамі.

Гарадзі агні Рыбінска ў Закаўказзі, буйнейшыя поспехі атрымліваюць рабочыя і калгаснікі Закаўказзя ў барацьбе за нафту, бавоўну і субтропічныя культуры. Будуюцца буйнейшыя тэкстыльныя прадпрыемствы ва Ўзбекістане, дзесяткі і сотні іншых прамысловых прадпрыемстваў у нацыянальных рэспубліках і абласцях. І вакол гэтых новых прамысловых ачагоў растуць і мацнеюць кадры новага нацыянальнага пролетарыята, усё больш мацнее база пролетарскай дыктатуры, мацнее ўплыў пролетарыята ва сялянстве.

Калі прыбраная ўласнасць і капітал пазбавілі раз'яднаюць людзей, распальваюць нацыянальную варожасць і ўзмацняюць нацыянальны ўціск, то калектыўная ўласнасць і праца таксама аб'ядноўваюць людзей, падрываюць нацыянальную варожасць і змяцняюць нацыянальны ўціск» — указваў тав. **СТАЛІН** яшчэ на X з'ездзе партыі.

Жыццё падказала ўсю правільнасць гэтых прагрэсіўных сцвярджэнняў тав. Сталіна.

Гэтыя поспехі **соцыялістычнага будаўніцтва ў нацыянальных абласцях** не далося самацёкам. Яны дасягнуты ў рэзультаце перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі, разгрома рэакцыйна-кадэцкіх шавіністаў і буржуазных нацыяналістаў.

Пераход нашай партыі да разгорнутага соцыялістычнага наступлення, на шырокі соцыяльны калектывізацыі і ліквідацыя кулацтва як класа, выкарчоўванне апошніх карэнняў капіталізма натыкаўся на распачатае супраціўленне буржуазна-нацыяналістычных элементаў, якія змагаюцца за захаванне прыватнай уласнасці, мараць аб рэстаўрацыі капіталізма. Рэшткі здыхаючых капіталістычных класаў усялякі маскуюцца прыбягалі да самых розных форм слабатання, шкодніцтва, разлажэння [illegible] калгасаў, [illegible] у совецкія ўстановы і г. д.

Гэтую лютую тактыку класавы вораг перанёс і на ўчастак [illegible] нацыянальнай палітыкі. Рэзалюцыі аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)У па дакладу тав. Каснёра аб выліках і [illegible] задачах [illegible] паказвае, да якіх складаных [illegible] прыбягалі і прыбягаюць [illegible] - нацыяналістычныя элементы, пратыўчы ператварэння [illegible] ў калонію польскага і нямецкага фашызма. Гэта подлая работа буржуазных украінскіх нацыяналістаў, кіруемых імперыялістычнымі інтэрвентамі, была аблегчана крытыцізмам большэвіцкай пільнасці і тымі памылкамі, якія былі дапушчаны кампартыяй Украіны.

Контр-рэвалюцыйныя элементы, каруцючыся аслабленнем большэвіцкай пільнасці партыйных арганізацый, пры патурэнні, а часамі і ўдзельнасці некаторых «комуністаў», пазбаўленых нацыянал-ухілісцкім духам, расстаўлялі свае сілы для арганізацыі сабатажа і шкодніцтва.

Пад фальшывым сцягам украінізацыі яны ажыццяўлялі буржуазна-нацыяналістычныя метады ўзаемнага адчужэння працоўных розных нацый і распальвання нацыянальнай варожасці.

Буржуазныя нацыяналісты ні на чым не спыняліся для ператварэння сваіх шкодніцкіх мэт. Яны ламалі, скажалі багацейшую украінскую мову, свядома засмечваючы яе польскімі, нямецкімі словамі, вытручваючы з яе агульныя элементы з рускай мовы. Гэта было адным са звонных «пры рока задумацага» плана адарвання Украіны ад Совецкага Саюза. Ягы праводзілі шалтоўную «украінізацыю» ў школах.

Класавы вораг карыстаўся прамым падтрыманнем украінскіх нацыянал-ухілісцкіх элементаў. Даволі ўспомніць антыкартыйную нацыянал-ухілісцкую групу Шумскага і інш., выкрытага ў свой час украінскай партыйнай арганізацыяй, узначальваемай тав. **КАГАНОВІЧАМ.**

За апошнія гады адбылося афармленне новага нацыяналістычнага ўхілу ў партыі, які ўзначальваўся Н. А. Скрыпнікам. Далёка не выпадкова Скрыпнік скаціўся на пазіцыі украінскіх нацыяналістаў, прабаваўных выкарыстаць левінскую нацыянальную палітыку ў інтарэсах кулацкага нацыяналізма для падначалення Украіны замежным капіталістам і памешчыкам. Абвалакванне Скрыпніка украінскімі нацыяналістамі пачалося яшчэ ў 1923 годзе, калі ён пры абмеркаванні пытання аб аб'яднанні совецкіх рэспублік у саюзную дзяржаву выказаўся супроць ідэі стварэння саюзнай дзяржавы, выступаючай перад тварам знешняга ворага, перад тварам капіталістычнага акружэння, як адзіны саюз. Яшчэ тады тав. Сталін на нарадзе па нацыянальнаму пытанню ўскрыў апартуністычную сутнасць пазіцыі Скрыпніка і Ракоўскага.

Партыя праводзіла і праводзіць ленінскую нацыянальную палітыку ў барацьбе на два фронты.

Рэзалюцыя аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)У адзначаючы, што **«вялікадзяржаўны рускі шавінізм з'яўляецца па-ранейшаму галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго Совецкага Саюза і ўсёй УсеКП(б)»**, разам з тым прама ўказвае, што **«ў некаторых рэспубліках СССР, у асаблівасці на Украіне ў даны момант галоўную небяспеку прадстаўляе мясцовы украінскі нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі».**

Пад кіраўніцтвам і пры падтрымане ленінскага ЦК УсеКП(б), пад кіраўніцтвам правадыра партыі і працоўных тав. **СТАЛІНА**, умелічага як ні хто разгадаць усе ізгібы тактыкі класавага ворага, кампартыя Украіны выкрыла дапушчаныя ёю памылкі, намеціла ў пастановах пленума цэльную праграму ў галіне бліжэйшых задач правядзення нацыянальнай палітыкі, у галіне інтэрнацыянальнага выхавання мас.

У найкарацейшы тэрмін па прапазіцыі апошняга года дасягнут сур'ёзнейшы пералом ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва на Украіне. **Бліскучая перамога калгасаў Украіны — прамы рэзультат большэвіцкага разгрома кулацка-нацыяналістычных элементаў.**

На зло шкодніцкай [illegible] інтэрвентам укаўшена ідуць пад большэвіцкім кіраўніцтвам да заможнага жыцця украінская калгасы, усё больш выразна і беспрэцэдэнтна працуе соцыялістычная індустрыя Украіны. Расцвітае украінская совецкая нацыянальная культура, якую хацелі задушыць знявечыць наймёты германскага і польскага фашызма. Несакрушальна магутнасць украінскіх рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных, кіруемых большэвіцкай партыяй.

Рашаючую ролю ва ўсіх перамогах соцыялізма, аб якіх расказвалі нядаўна ў «Праўдзе» украінскія калгаснікі і рабочыя, адыграла ўмацаванне партыйнага кіраўніцтва Украіны і дакамога ЦК УсеКП(б).

І зараз, напярэдадні XVII партз'езда, Украінская Соцыялістычная Совецкая Рэспубліка мае права ганарыцца сваімі дасягненнямі. Сярод перадавых нацыянальных рэспублік і абласцей Украіна займае належачае ёй месца непахіснай крэпасці пролетарскай рэвалюцыі.

«Уходзячы ад нас, тав. Ленін завяшчаў нам, умацоўваць і пашыраць Саюз рэспублік. Клянёмся табе, тав. Ленін, што мы выканаем з гонарам і гэтую тваю запаведзь»,—гаварыў тав. СТАЛІН дзесяць год назад над труной Леніна.

Партыя з гонарам выканае гэту вялікую большэвіцкую клятву, яна забяспечыла поўную перамогу ленінскай нацыянальнай палітыкі.

ПРАЦОЎНЫЯ БССР РЫХТУЮЦЬ БОЛЬШЭВІЦКУЮ СУСТРЭЧУ XVII З'ЕЗДУ ПАРТЫІ

СПАБОРНІЦТВА НА ЗАВАЯВАННЕ ГАНАРОВАЙ НАЗВЫ ІМЯ СЕМНАЦЦАТАГА

На мітынгу рабочых першай змены швейнай фабрыкі **«Кастрычнік»**, прысвечаным падрыхтоўцы **да XVII з'езда партыі**, крысутнічала каля тысячы чалавек. У рэзалюцыі, прынятай па мітынгу, рабочыя ўзялі на сябе рад канкрэтных самаабавязацельстваў па выкананню вытворчай праграмы і разгортванню грамадска-масавай работы.

Першы і асноўны абавязак—завяршэнне прамфінплана першага года другой пяцігодкі па ўсіх паказальніках **да 28 снежня**, а студзеньскага задання плана 1934 г.—**да 25 студзеня—дня адкрыцця з'езда.** Замест 0,5 проц. браку, дапускаемага планам, рабочыя абавязаліся знізіць яго да 0,2 проц.

На фабрыцы ўжо разгарнулася спаборніцтва памён агрэгатамі і брыгадамі на заваяванне права насіць назву імя XVII з'езда партыі.

На мітынгу выступала шмат рабочых, якія ў гонар з'езда бралі на сябе канкрэтныя абавязкі. Старшыня цэхкома першага агрэгата першай змены тав. **Падольская** абавязалася ў першы квадрыхтоўцы да з'езда ажыццявіць прафработу ў цэху. Парторг адной з брыгад другога агрэгата тав. **Дзюкін** выступіў ад імя партгрупы з запэўненнем, што іх брыгада будзе па-большэвіцку змагацца, каб першай атрымаць ганаровую назву імя XVII з'езда.

Зараз фабрыка **«Кастрычнік»** дае не дрэнныя пакуль выкананні прамфінплана. Не следзячы на вялікія перабоі ў падачы электраэнергіі, ліквідаваўскі прамфінплан на 25 гэтага месяца быў выкананы на 96 проц. Можна спадзявацца, што зараз, на аснове спаборніцтва, якое разгарнулася пад лозунгам заваявання права на атрыманне ганаровай назвы імя XVII з'езда, фабрыка па-большэвіцку завершыць прамфінплан першага года другой пяцігодкі і новымі перамогамі адзначыць гістарычную дату пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства.

Ф.

Зняць фабрыку з чорнай дошкі—абавязаліся добрушскія папернікі

23 лістапада на Добрушскай фабрыцы **«Герой працы»** адбылася фабрычная канферэнцыя ўдарнікаў, на якой падводзіліся вынікі работы фабрыкі ў 1933 годзе і абгаварвалася праграма 1934 года.

У спрэчках выступала больш 15 чалавек. **Цэлулознікі, папернікі, электрыкі заўважылі на канферэнцыі, што фабрыка «Герой працы» мае ўсе магчымасці ліквідаваць прарыў 1933 года і ўзяць большэвіцкі размах работы ў 1934 годзе.** Усё залежыць ад таго, як фабрычныя арганізацыі перабудуюць сваю работу.

Паведамленне аб склікані XVII партз'езда рабочыя фабрыкі **«Герой працы»** сустрэлі з вялікім энтузіязмам. Па цэхах праведзены сходы, на якіх абгаварваліся пастановы канферэнцыі ўдарнікаў. Рабочыя ўзялі на сябе абавязацельствы прыкладзі ўсе намаганні да таго, каб зняць фабрыку з чорнай дошкі і сустрэць XVII з'езд партыі поўнай ліквідацыяй прарыва.

Учора на фабрыцы была пушчана 6-я ткацкая машына. Выпрацоўка паперы павялічылася 25 лістапада на 25 проц. У бліжэйшыя дні будзе пушчан завод па выпрацоўцы саломеннай цэлулозы.

П.

6 помп звыш плана

Пасля работы 24 лістапада ва ўсіх цэхах завода **«Пролетарый»** адбыліся сходы рабочых, прысвечаныя склікані XVII партыйнага з'езда.

Рабочыя **чыгуна-ліцейнага** цэха абавязаліся выпусціць звыш плана ў падарунак з'езду дзве двухдзюймовыя помпы. Механічны цэх абавязаўся таксама выканаць датэрмінова праграму і выпусціць звыш плана чатыры помпы. Арматурнікі абавязаліся нашаць гадавы план да 20 снежня, а таксама датэрмінова закончыць выпуск запасных частак для трактараў. Рабочыя завода ў цэлым абавязаліся фінплан 4-га квартала скончыць да 15 снежня.

Пр.

Камінтэрнаўцы набіраюць тэмпы

Разгортванне вытворчага паходу імя тав. **Гікало** на гомельскай швейнай фабрыцы **«Камінтэрн»** ўжо дало свае вынікі. Нарастанне тэмпаў наглядаецца са дня на дзень. **Бручнасуконны** цэх выконвае план з дадатковым заданнем, каб пакрыць запазы чанасць мінулых кварталаў. За дзве дэкады лістапада план выканан на 104,8 проц. Добрыя паказальнікі дае **шапачны цэх (107,6 проц. плана); цэх блізны № 1 (102,2 проц. плана). Аднак асобныя цэхі яшчэ не выконваюць плана.**

Паход узнёў энтузіязм мас. Асабліва ўзняўся вытворчы энтузіязм рабочых фабрыкі ў сувязі з паведамленнем аб скліканні XVII партз'езда. 25 лістапада па ўсіх цэхах адбыліся кароткія мітынгі, прысвечаныя падрыхтоўчай рабоце да з'езда. Рабочыя абавязаліся ў гонар з'езда яшчэ больш узняць тэмпы і якасць сваёй работы, выканаць усе ўзятыя на сябе абавязацельствы па разгортванні вытворчага паходу імя тав. **Гікало.**

К.

МЕНСК, ЦКМОЛ—ГЕРЦОВІЧУ ДЛЯ ЗЛЁТА ЎДАРНІКАЎ АБАРОНЫ

Шлю палкае прывітанне комсамольцам і працоўнай моладзі Беларусі—лепшым ударнікам абароны, якія паказваюць прыклад у барацьбе за ўмацаванне пролетарскай дыктатуры і аховы граніц Совецкага Саюза.

Сакратар ЦК А. КОСАРАЎ.

Тав. ЭЙДЭМАН АБ ЗЛЁЦЕ

УСЕБЕЛАРУСКІ АБАРОННЫ ЗЛЁТ МОЛАДЗІ — ДАСКАНАЛЫ ПАЧЫН, ЯКІ ЗАСЛУГОЎВАЕ АСАБЛІВАЙ УВАГІ. НЕ СУМНЯВАЮСЯ, ШТО ПАЧЫН БЕЛАРУСКІХ КОМСАМОЛЬЦАЎ І АСОАВІЯХІМАЎЦАЎ БУДЗЕ ХУТКА ПАДХОПЛЕН ІНШЫМІ КОМСАМОЛЬСКІМІ І АСОАВІЯХІМАЎСКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ СССР.

ЗЛЁТ ПАВІНЕН УЗВАРУШЫЦЬ, УЗНЯЦЬ ЯШЧЭ ВЫШЭЙ АБАРОННА-ГРАМАДСКУЮ РАБОТУ БЕЛАРУСІ. У ПРЫВАТНАСЦІ, ЁН БУДЗЕ ЗМАГАЦЦА ЗА ТАКІЯ ДАСКАНАЛЫЯ ЗАДАЧЫ, ЯК ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ НОВЫХ ВАРАШЫЛАЎСКІХ СТРАЛКОЎ, СТАЯЧЫХ НА ВАРЦЕ НАШЫХ МЕЖАЎ, ЯК СТВАРЭННЕ НЕ НА СЛОВАХ, А НА СПРАВЕ УСЕБЕЛАРУСКАГА АВІЯКЛУБА, ЯК УЗМАЦНЕННЕ АСОАВІЯХІМА І ЎЗНЯЦЦЯ НА БОЛЬШ ВЫСОКІ ЯКАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ УСЕЙ ЯГО ШМАТГРАННАЙ РАБОТЫ.

ТАК, МЫ ВАЙНЫ НЕ ХОЧАМ!

ТАК, МЫ ШЧЫРА РАДУЕМСЯ ПОСПЕХАМ МІРНАЙ ПАЛІТЫКІ НАШАГА СОВЕЦКАГА ЎРАДА.

АЛЕ РАЗАМ З ТЫМ АБАРОННЫ ЗЛЁТ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ ЗЛЁТ ЎДАРНІКАЎ — НОВАЕ, ГРОЗНАЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ ЎСІМ НАДПАЛЬШЧЫКАМ ВАЙНЫ, УСІМ ІНТЭРВЕНТАМ.

МЕЖЫ СОВЕЦКАГА САЮЗА СВЯШЧЭННЫ І НЕПАРУШНЫ!

Р. Эйдэман

Удзельнікам усебеларускага комсамольскага маладзёжнага злёта ўдарнікаў абароны

Ударнікам абароны шлёпае большэвіцкае прывітанне! Вы сабраліся падагуліць вынікі баявой вучобы па абароне заваявання Кастрычніка. Вы гэтым самым яшчэ раз даказваеце ўсё ўзрастаючую класавасць і высока-рэвалюцыйную свядомасць працоўных, у любы момант гатовых стаць на абарону інтарэсаў рабочага класа.

Таварышы ўдарнікі абароны! Вы сваім невычарпальным энтузіязмам, комсамольскім задорам і энергіяй паказалі бліскучыя прыклады на радзе ўчасткаў социялістычнага будаўніцтва і, у прыватнасці, створаная па вашай ініцыятыве «лёгкая кавалерыя» бліскуча даказала сваю гатоўнасць і здольнасць змагацца з бюракратызмам, расхлябанасцю, безгаспадарчасцю і г. д.

Зараз вы, падводзячы вынікі ўдарнай работы па абароне краіны, па вінны памятаць, што мірная палітыка была, ёсць і будзе палітыкай СССР, але-ж мы павінны памятаць і тое, што шмат ахвотнікаў ёсць сярод імперыялістычных драпежнікаў выратаваць свае цяжкасці за кошт СССР, і таму зусім шкодна будзе захапляцца тымі поспехамі, якіх вы дасягнулі за час ударнай вучобы. І мы ўпэўнены, што комсамольска-маладзёжная ўдарная калона абароны і надалей будзе па-большэвіцку высока трымаць пекаховы большэвіцкі прызыў «нацаваць магутнасць непераможнай Чырвонай арміі—ўмацоўваць абарону СССР».

Няхай жыве ленінская комуністычная партыя на чале з правадыром тав **Сталіным!**

Няхай жыве ленінскі комсамол!

Няхай жыве Чырвоная армія!

Старшыня ЦКК КП(б)Б ЛЫЧОЎ.

„ДРУГАЯ ЗАПАВЕДЗЬ—ССЫПКА НАСЕННЯ" (СТАЛІН)

ПАДРЫХТОЎКУ ДА XVII ПАРТЗ'ЕЗДА АДЗНАЧЫМ ПОУНАЙ ССЫПКАЙ НАСЕННЯ

НЯДБАЙНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ССЫПКІ, АЧЫСТКІ І ЗАХАВАННЯ НАСЕННЫХ І СТРАХАВЫХ ФОНДАЎ—НА РУКУ КЛАСАВАМУ ВОРАГУ, ЗНІЖАЕ УРАДЖАЙ БУДУЧАГА Г

Насустрач XVII з'езду большэвікоў

Добра працуе малатарня. Тону за тонай адвозіць комсамольскі сакратар МАЛАШЭВІЧ АЛЕСЬ абмалочаны авёс у сэйран, дзе два «Трыумфы» сартуюць яго для высокакласнага насення.

У асобным сэйрне пляжыць насенне ячменю на 30 га, яравой пшаніцы на 3 га, авёса на 107 га. У буртах — бульба на 81 га.

— Гэтымі днямі, — кажа старшыня калгаса тав. МАЦЮК — мы бурты разварылі. Палітаддзел глядзеў. Бульба высокакласная, захоўваецца добра. Ячмень, самі бачыце, каліва ў каліва.

К нікопі, працавала сёння малатарня. Суботнік у жалезны фонд абароны краіны пачаўся фактычна яшчэ напярэдадні, калі сёнагалосна ўхвалена было малаціць усю ноч, каб назаўтра ўвечары 26 лістапада рапартаваць канферэнцыі ўдарнікаў-калгаснікаў Новадворскага сельсавета аб ссыпцы ўсіх насенных і страхавых фондаў.

Яны дабіліся свайго — насенне добра ачышчанае, адсартаванае поўнасцю ссыпана. Добра пастаўлена захаванне насення ў калгасе «ПЕРШАЯ КОННАЯ».

Баланс калгаснай працы

Добра працаваў калгас увесь год, таму ён з добрымі вынікамі прышоў да размеркавання ўраджаю. І калі ўвечары, паспа дакладна начальніка палітаддзела МТС тав. КАМЕНШТЭЙНА канферэнцыя калгаснікаў-ударнікаў Новадворскага сельсавета дала слова калгасу для дакладнага — тав. МАЦЮКУ асабліва гаварыць не трэба было — усе вынікі работы калгаса за год былі паказаны ў развешаных па сценах дыяграмах:

— За кошт запежаў і выкарыстання ўсёй наўдобіцы калгас у 1933 г. павялічыў пасеўную плошчу на 60 га.

— Ураджайнасць аднаго га жыта павялічылася з 6,4 цэнт. у 1932 г. да 14,85 цэнтн. у 1933 г. Пшаніцы з 2 цэнтн. да 13 цэнтн., авёса з 6,8 цэнт. да 11 цэнтн., бульбы з 74 цэнтн. да 100 цэнтн.

— Спрэдняя ўдойлівасць кароў на МТФ павялічылася з 1000 літраў да 1,270. Колькасць маладняка — ад 24 галоў да 40.

А калі да гэтых лічбаў дадаць, што непадзельны калгасны капітал за год вырас ад 76.000 руб. да 112.000 руб., то тады нам стане зусім ясным, як калгас «Першая конная» ідзе да заможнага жыцця.

Калгас канчае ссыпку насенных і страхавых фондаў. Складзен кармовы баланс з разлікам 300 дзён на коняй і 220 дзён на дойную карову. Рабочы конь атрымае на дзень 8 кгр. сена і канюшыны, 2 кгр. макіны і сечкі, 2 кгр. яравой саломы, 3 кгр. аўса і 2 кгр. подсціла. Дойная карова атрымае 8 кгр. сіласа, 8 кгр. буракоў і турнэпсу, 2 кгр. сена, 3 кгр. мякіны, 4 кгр. яравой саломы і 2 кгр. подсціла.

Далёка мы крочым наперад

— Цяпер, — кажа адзін з першых ударнікаў калгаса тав. ЕРМАЛОВІЧ МІХАСЬ, — можна і да размеркавання ўраджаю прыступіць. Сталіна слова цалкам апраўдаліся— ад большэвіцкай працы і вынікі большэвіцкія.

— Было летась на працадзень 1,9 кгр. абожжавых культур, а сёлета 5,5 кгр. Было летась бульбы 7 кіло, а сёлета 14,6 кіло. І саломы летась 3,8 кгр., і яравой 2,5 кгр., і сена 2,4 кгр., і гародніны два кілаграмы. А грошай—летась падзь да рубля дацягнулі, а сёлета ўжо рубель авансам атрымалі на працадзень і яшчэ па рублю будзе. Во як яно вышла.

Ермаловіч з жонкай жывуць разам з двума шэфрамі — маладымі хлапцамі, калгаснымі ўдарнікамі. Разам сабрала ся ў іх за 10 месяцаў 800 працадзён. Закончыцца — збожжавых 275 пуд., бульбы 725 пуд., грошай — 1.600 руб лёў і шмат чаго іншага. А ў гаспадарцы кароўка ёсць, кабаноў пара, парасяты.

— Як бачыце, — кажа Ермаловіч, — адсюль і да заможнасці недалёка.

Брыгада сустракае XVII з'езд УсеКП(б)

Паведамленне аб XVII з'ездзе партыі выклікала ў калгасе пазачарговую пільнасць да ўсіх пытанняў, звязаных з ажыццяўленнем указанняў тав. СТАЛІНА аб заможнасці калгаснікаў.

Не ўсё добра ў калгасе з запісам выпрацаванага працадзён. У брыгадах мела месца некаторая ўраўнілоўка, калі за розную работу аднолькава плацілі, калі механічна прымаліся нормы аплаты, прысланыя НКЗ, без улікі мясцовых умоў і асаблівасцей. І не мала было выпадкаў, калі калгаснікам на працэнты запісвалі 40 сотак на працадзень, а за работу больш лёгкую на дапаможнай гаспадарцы запісвалі працадзень і больш.

Больш увагі трэба звярнуць на ахову калгаснага дабра. Быў такі выпадак 21 лістапада, калі вартавы Кіранеўскі Максім замест таго, каб вартаваць сэйран з калгасным дабром, сеў у хаце разам з госцямі п'янствавацъ. Праўленне калгаса да яго ніякіх мер не ўжыло. А ён назаўтра зноў тое-ж самае паўтарыў.

Вось чаму гучным рэхам прагучэў на канферэнцыі заклік тав. Сталіна да ўсіх калгаснікаў: «Беражыце калгаснае дабро».

Вось чаму брыгада № 2 МАЛАШЭВІЧА АЛЕСЯ, абавязаўшы сябе ўдарнай брыгадай імя XVII з'езда УсеКП(б), узяла на сябе абавязак: правяць размеркаванне ўраджаю так, каб подыр но нажываўся за кошт ударніка; добрым доглядам за коньмі прывесці іх у поўную гатоўнасць да весняй сяўбы: для забеспячэння ўраджаю 1934 года вывезці з горада дацёкова на калгасныя палі 240 возоў гною; да кожнага члена брыгады прымацаваць інвентар, за рамонт якога ён нясе адказнасць перад усёй брыгадай; выпучыць камісію з т. т. Малашэвіча, Ермалаева і Валодзькі для сістэматычнага нагляду за становішчам ссыпаных фондаў; усёй брыгадай уступіць у агратэхнічны гурток, арганізаваць навадзець вечарнюю школу; арганізаваць гурток па вывучэнню машын, адным словам, зрабіць усё, каб сустрэць XVII партз'езд падрыхтаванымі да вясны. Пасля з'езда ўсе яго пастановы дакладна распрацаваць у брыгадзе.

Гучнымі воплескамі ўхвалена канферэнцыя паведамленне другой брыгады:

І яму ў адказ, недзе ў кутку вялікай залі, падняласа цётка РУСАЛЬСКАЯ НАСТА:

Пераканалася і я ў выніках калгаснай працы, вы ў калгасе добра жывеце. Дык прыміце і мяне ў калгас.

НАЙПЕРШАЯ ЗАДАЧА

Першы год другой пяцігодкі з'яўляецца годам вялікіх перамог у барацьбе за стварэнне социялістычнай працоўнай дысцыпліны ў калгасах, за павышэнне ўраджайнасці і якасці сельскагаспадарчай прадукцыі, за большэвіцкім калгасы і заможнае жыццё калгаснікаў.

Гэта год кардэннага змянення метадаў кіраўніцтва ўсёй работай у вёсцы, год вялізарных дасягненняў у арганізацыйна-палітычным і гаспадарчым узмацненні калгасаў, паляпшэння матэрыяльна-бытавых і культурных умоў жыцця калгаснікаў. 3—5 кгр. збожжа, 8, 10, 12 кгр. бульбы, не лічачы другіх плодагародных культур, атрымлівае ў сярэднім калгаснік на працадзень.

Цяпер задача заключаецца ў тым, каб па-большэвіцку падрыхтавацца да веснавой сяўбы 1934 г. і ў першую чаргу мабілізаваць усю калгасную масу на свячасовую ссыпку добраякаснага насення.

Між тым, такому важнейшаму ўчастку, як ссыпка насенных і страхавых фондаў, дагэтуль не аддаецца належнай увагі з боку раду партыйных і совецкіх арганізацый, а таксама і з боку асобных палітаддзелаў МТС.

Паводле даных 44-х раёнаў БССР, на 20 лістапада 1933 года з 5.000 калгасаў толькі палова ссыпалі насенныя і страхавыя фонды на збожжы і толькі ў 700 калгасах ссыпалі насенную і страхавую бульбу. Такое становішча са ссыпкай насенных і страхавых фондаў, калі пераважная большасць калгасаў як аболтоўваемых МТС, так і неабслугоўваемых даўно ўжо выканалі абавязацельствы перад дзяржавай і разлічыліся за работы МТС, з'яўляецца яўна ненармальным.

У радзе месц назіраецца недапушчальнае скрыўленне дырэктыў партыі і ўрада аб ссыпцы насенных і страхавых фондаў. У калгасах «Ударнік», «Пролетарская перамога», імя Леніна, БАРЫСАЎСКАГА раёна, насенныя і страхавыя фонды ссыпаюць неадсартаванымі збожжам, прычым адыходы на сартыроўку (размер якіх можа дасягнуць 25 проц. колькасці насення) не ўлічваюцца.

У калгасе «Серп і молат» насенфонд ссыпан нядобраякаснай вільготнай пшаніцай.

У той час, як па бульбе страхавыя фонды павінны складаць 20 проц. да насенных, у радзе калгасаў Барысаўшчыны страхфонды ссыпаюць толькі ў размеры ад 10 да 15 проц. У калгасе «Пролетарская перамога» страхавы фонд па бульбе складае 9,3 проц. да ссыпанага насення, у калгасе «Другая пяцігодка» — 10 проц. Насенныя фонды ссыпаюцца часта «на вока», прыблізна, без вагі, без меры. Страхавога фонда не аддзяляюць ад насеннага.

Гэтыя факты сведчаць аб тым, што да ссыпкі насенных фондаў у некаторых раёнах адносяцца зусім безадказна.

Неабходна растлумачыць ўсім працаўлеўцам калгасаў і калгаснікам, што насенне лічыцца ссыпаным толькі тады, калі яно будзе поўнасцю ачышчана і адсартавана. Акрамя таго, трэба ссыпаць страхавыя фонды на збожжы не менш 10-15 проц., па бульбе не менш 20 проц.

Ні ў якім разе нельга дапускаць памяншэння нормы высева яравых культур. Пры ссыпцы насенных фондаў трэба выходзіць з наступных устаноўленых норм высева (пры ўсходжасці не менш 95 проц.): на жыту пры радковай сяўбе — 1,6 цэнт. на гектар, пры раскідной сяўбе — 1,8 цэнт.; аднаводна па пшаніцы — 1,6 цэнт. і 1,8 цэнт.; аўсу — 1,8 цэнт. і 2 цэнт.; ячменю — 1,6 і 1,8 цэнт.; грэчкі — 0,8 і 1 цэнт.; просу — 0,25 і 0,3 цэнт.; гароху — 1,3 і 1,6 цэнтн.

Ссыпку насенных фондаў трэба рабіць, выходзячы з плошчы яравой сяўбы 1933 года. Прычым, калі фактычная плошча сяўбы ў 1933 годзе аказалася менш планавай, дык фонды неабходна ссыпаць, выходзячы з планавай плошчы пасеваў.

Сабранае збожжа павінна быць абавязкова прачышчанае, сухое, адсартаванае. За насеннем неабходна ўстанавіць сістэматычны нагляд. Трэба перыядычна пералапачваць насенне, каб не дапусціць пролаці, гарэння і г. д. Вельмі важна рабіць частую праверку ўсходжасці насення.

Лешныя актывісты-ўдарнікі, калгаснікі-вопытнікі павінны ўключыцца ў гэтую справу і ўзяць пад кантроль гэту важнейшую работу.

На ахову насення неабходна паставіць лешных, праверэных калгаснікаў. Трэба арганізаваць ахову так, каб ні адно зерня не загінула, каб класавы вораг не мог пашкодзіць гэтай социялістычнай калгаснай уласнасцю.

Каб дабіцца большага ўраджаю, увесь калгасны актыў павінен за перыяд да веснавой сяўбы дакладна вывучыць агра-тэхнічныя мерапрыемствы (нормы высева, як праводзіць заделку насення, глыбіню ворыва, унясенне і г. д.).

Ні на адну хвіліну нельга забываць указаванняў правадыра партыі тав. СТАЛІНА аб новай тактыцы, новых маневрах, якія ўжываюць класава-варожыя элементы ў сваёй антысавецкай і антыкалгаснай рабоце. Трэба памятаць, што імённа на ўчастку насення, імённа на насенныя і страхавыя фонды класавы вораг — кулак, яго агентура напрабуюць наклясці сваю лапу, каб сарваць веснавую сяўбу 1934 года.

Таму на гэтым участку патрабуецца асаблівая пасцярожанасць, асаблівая пільнасць.

Такім чынам, неадкладна прачысціць і ссыпаць насенне, свячасова пратруціць яго, арганізаваць кантроль за хаванням, — такова найпершая задача ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы другога года другой пяцігодкі.

П. КАРОЎНІКАЎ.

ПРЫВІТАННЕ К. Е. ВАРАШЫЛАВА 4-Й КАВАЛЕРЫЙСКАЙ ДЫВІЗІІ

Вішную байцоў, камандзіраў, калітработнікаў 4-й чырвонасцяжнай кавалерыйскай дывізіі са слаўнай 15-й гадавінай.

Як баец 4-й кавалерыйскай, радуюся разам з вамі, што ваша дывізія —асноваположніца першай коннай арміі—з гонарам захоўвае свае добрыя баявыя традыцыі, выхоўвае на іх маладых сваіх байцоў і дабілася ў цяжкіх пакуль умовах найлепшых рэзультатаў баявой і палітычнай падрыхтоўк

Ні адной гадзіны прастоя вагона

ПАГРУЗКУ І ВЫГРУЗКУ ПРАВОДЗІЦЬ БЕСПЕРАБОЙНА

ТЫСЯЧЫ СТРАЧАНЫХ ВАГОНАЎ

На шырока разгалінаванай сетцы чыгуначных дарог імкнецца цячыні з соцыялістычнымі грузамі нашай багатай, усё ўзрастаючай народнай гаспадаркі. Вугаль, руду, жалеза, машыны, вобжыма тысячамі вагонаў штодзенна развозяць чыгунка па розных кутках неабсяжнага Савецкага Саюза. Расце краіна—растуць перавозкі. Але вось-ніць транспарт усё яшчэ мала супроць таго, што пазнней вазіць. Пагрузкі застаюць.

61.000 вагонаў павінна чыгунка СССР грузіць штодзенна. Павінна, але не грузіць. Чаму? У першую чаргу таму, што вагонны парк лімітуе перавозкі. Не хапае паражняка. І пар тыя побач з пашкам на прамысловасць, якая выпускае новыя вагоны, патрабуе максімальнага скарыстання наяўнага парка, жорсткай барацьбы з антыдзяржаўнымі адносінамі да вагонаў, выканання пагрузачна-разгрузачных планаў.

Адсюль і пытанне рэгулявання вагоннага парка на дарогах, правільнага размеркавання яго па сетцы чыгунак мае выключна важнае дзяржаўнае значэнне. Трэба размеркаваць вагонны парк так, каб штодзенна задавальніць у першую чаргу найбольш адказныя ўчасткі перавозак. Для забеспячэння гэтай задачы выдаецца так званы рэгулёвачны загад. Пяркаскласка. Ён дакладна прадугледжвае колькі кожная дарога і раён павінны да 18 гадзін штодзенна выкідваць паражняка на суседнюю чыгунку. Загад рэгулюе вагонны парк паміж дарогамі краіны.

Гомельскі чыгуначны раён павінен колькі дзень аддаць па Паўднёва-Заходнюю чыгунку і суседнія раёны тысячы вагонаў. Патрабуецца арганізаваная, баявая работа па разгрузцы, каб ні адной лішняй гадзіны вагон не стаяў. Але штодзенна сотні вагонаў застаюцца на рэйках неразгружанымі. То кліентура затрымлівае, то самі стацыі не справяляюцца з работай. Тады к чорту ляцяць рэгулёравачнае заданне, амерзаюцца сотні вагонаў, ператвараючыся ў складзкія цамляжаны на рэйках. І ў разультаце—заўтра планы пагрузкі цэлай дарогі будуць сарваны. Тысячы тон руды, металу, вугалю застануцца ляжаць, чакаючы вагонаў.

Дыспетчары-ж спакойна выконваюць свой «абазвазак» і ў 18 гадзін вазуратна заносяць у свабодную графу непорадкавых поўзню вагонаў - двухэтажную або трохэтажную лічбу.

Які-ж улік вядзе старшы дыспетчар Гомельскага раёна? Ці апраўдваюць сабе яго праца і клопаты? У яго вядома, што **за кастрычнік звыш нормы было 134.948 вагона-гадзін прастою па раёну**, а за першую дэкаду лістапада—3.380. У яго таксама вядома, колькі з гэтых гадзін прыходзіць на на кожную стацыю: на станцыю **Гомель** за кастрычнік і першую дэкаду лістапада—17.815 гадзін, на станцыю **Калінкавічы**—2.500 і г. д. Толькі гэта вядома старшаму дыспетчару. Больш яго і не цікавіць. Ні канкрэтныя вінаватыя ў незаконным прастоі, ні меры спагнання. А лічбы-ж прастоя крычаць трывогай. Яны крычаць аб нязгуваных барбарскіх адносінах да транспартных сродкаў, у якіх краіна адчувае такі вялікі недахват, яны крычаць аб тысячах мар на патрачаных дзяржаўных рублях. І якраз, патрэбна самая актыўная барацьба з гэтым злом, а не спакойная фіксацыя ў чыноўніцкіх зводках.

Але не будзем запала патрабаваць ны да дыспетчара. Не толькі ён, але кіраўніцтва раёна, у прыватнасці начальнік аддзела эксплуатацыі (ёнжа намеснік начальніка раёна) Багінскі далёк ад актыўнай барацьбы з канкрэтнымі вінаватымі ў антыдзяржаўных адносінах да вагонаў як з боку чыгуначнікаў, так і з боку кліентуры. Кіраўніцтва раёна не ўзяла чальвае і не кантралюе гэтай работы.

Хіба-ж так змагаюцца за выкананне рэгулёравачнага задання, за ажыццяўленне дырэктыў партыі аб максімальным выкарыстанні транспартных сродкаў?

Тав. Багінскі стараецца апраўдацца тым, што прыцягваюць да адказнасці за злачынны затрымані вагонаў самыя стацыі, што там ёсць вычарпальныя матэрыялы па гэтым пытанні. Як выявілася пры праверцы, апраўдаўчы Багінскага не маюць падставы. Стацыі, таксама як і кіраўніцтва раёна, не вядуць энергічнай барацьбы з прастоямі вагонаў.

Возьмем станцыю **Гомель**, важнейшы вузел, дзе штодзенна бываюць вялізарныя перапрастоі вагонаў. Як тут ідзе барацьба з канкрэтнымі вінаватымі? Начальнік станцыі **Кунін** неахвотна дае аб гэтым весткі. Прычына ясная: ён іх не мае, а не мае таму, што не займаецца гэтым пытаннем і не цікавіцца ім. Нецарма ён вымушаны быў звярнуцца да не зусім надзейнага сродка—патрабаваць дазвола РСІ на права атрымання вестак для газеты, а ён гэта выратуе яго ад непрыемнасці. Але манеўр не ўдаўся. Весткі ўсё-ж трэба было даць. І начальнік станцыі Кунін даручае... тэхніку **Шупасніка** і начальніку таварнай канторы **Амрому** «падрыхтаваць» іх. У разультаце «падрыхтоўкі» ўсё-ж нельга ўстанавіць прастою звыш нормы вагонаў асобна па віне чыгуначнікаў і кліентуры. Лічба 17.815 гадзін агульнага перапрастоя вагонаў за кастрычнік і першую дэкаду лістапада так і засталася нерасшыфраванай. Дакладнага ўліку і тут, як і ў кіраўніцтве раёна, няма. Сама-ж сістэма ўліку, як прызнае і сам тав. Амром, не забяспечвае дакладнасці. Ніякага кантроля ўліку, які праводзіцца вагаўшчыкамі, з боку станцыі няма.

Няма сумнення, што вялізарны процант перапрастоя вагонаў падае на кліентуру. Тав. Амром запэўніе, што кліентура—аспоўны вінаваты ў затрымаці вагонаў. Але нават той улік, які ёсць, і то вядзецца з чыста камерцыйнага пункта гледжання. Відома, што за верасень з кліентуры спагнана за перапрастой 1.240 руб. (за кожную гадзіну перапрастоя спагнаецца 1 руб.), за кастрычнік—875 руб., а за 15 дзён лістапада—567 руб. Тут напрошваецца некалькі пытанняў: па-першае, чаму так тапна абыходзіцца гомельскай кліентуры затрымане вагонаў? Расплачваючыся дзяржаўнымі грашыма, яна фактычна не несе за гэта ніякай адказнасці. Па-другое, куды дзеліся астатнія тысячы гадзін перапрастоя, якія лічацца ў месячных зводках, але за якія ні з кога не спагнаны штраф і ніхто да адказнасці не прыцягнут?

Мімаволі паўстае яшчэ адно пытанне: якава дапамога раённых гарытарыяльных арганізацый транспарту ў барацьбе з неаўратнымі кліентамі? Вельмі слабая.

Самым дрэнным кліентам лічыцца завод імя Ляпцускага. Нядаўні разоў таварная кантора прасіла гарадзкога пракурора (Мерзонка) прымяніць вінаватых да адказнасці, аднак да гэтага часу меры не прыняты і завод па-ранейшаму злачынна адносіцца да скарыстання транспарта. У таварнай канторы ляжаць дзесяткі перапісак, якія накіроўваліся яшчэ з мая месяца гарадзкому пракурору з прапановаю прымянення штрафа кліентуры, але ні адказа, ні штрафа не паступіла і да гэтага часу. Ці патрэбна больш доказаў ліберальных адносін да падрыўнічкай работы транспарта?

Ніколі не знімаюць адказнасці з кліентуры і з раённых арганізацый, трэба падкрэсліць, што «галоўная адказнасць і галоўная віна за дрэнную, невыстарчальную работу транспарта ляжыць на саміх работніках транспарта,—гэта трэба памятаць і не забываць. І калі партыя патрабуе з кліентуры транспарта і з яго пастаўшчыкоў акуратнай і пільнай работы, то яна ўдвая і ўтрая будзе патрабаваць з саміх транспартнікаў» («Правда»). Між тым, прыведзеныя факты гавораць, што і транспартныя арганізацыі дрэнна змагаюцца за вагонны парк. Бо нават па лініі свабй чыгуначнай—барацьба з канкрэтнымі вінаватымі ў перапрастоях не ўзята на адпаведную вышыню.

Вось на станцыі Гомель адпачываюць на затрымцы вагонаў дыспетчары Данкоў і Семянюк. Па іх віне сістематычныя перапрастоі. Аднак, да адказнасці ніхто з іх не прыцягваўся. 21 лістапада на станцыю Гомель прыбылі з Кавятопа тры экспартныя вагоны для Менска. Пратрымаўшы іх каля сутак, дыспетчар Дахноў пірнуў іх назад на Бахмач. Такіх выпадкаў аціцкай работы ў практыцы Дахнова лічыцца нямала. Мусіць і па гэты раз, у горшым выпадку, кіраўніцтва станцыі абмяжуецца процантным утрыманнем з пэнсіі. Ці варта дакладваць, што такая «барацьба» не можа і не прынясе патрэбнага эфекта?

Трэба спадзявацца, што палітадзел Гомельскага чыгуначнага раёна і гарком КП(б)Б усімуць барацьбу са злачынным скарыстаннем вагоннага парка на прынцыповую вышыню і дадуць на руках вінаватым у зрыве рэгулёравачнага задання, вінаватым у затрыманнях тысяч вагонаў, так неабходных народнай гаспадарцы нашай краіны.

Р. ДОДЗІН.

г. Гомель.

ПАГРУЗАЧНА-РАЗГРУЗАЧНАЯ ЧЭХАРДА, АБО ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ НА ВЕЦЕР

ЖЛОБІН.

Планавая пагрузка і выгрузка мае вялікае значэнне для паскарэння зваротa вагонаў і бесперабойнай работы транспарта.

Што-ж робіцца ў **Жлобінскім** раёне?

Ні кліентура, ні чыгунка не навучыліся яшчэ выразна маневраваць паражняком і рацыянальна яго выкарыстоўваць. Кліентура вельмі часта ўнікае аграфіцыі грузы маніпрутамі, а ў другіх выпадках, патрабуе больш вагонаў, чым патрэбна.

21 лістапада **Бабруйскаму** леспрамгасу было падана павоцце планавай заяўкі 35 вагонаў для пагрузкі дроў па станцыі Брок. Леспрамгас выкарыстаць паражняк адмовіўся, бо на месцы не было дроў, за што павінен плаціць чыгунцы штраф у 840 руб. **На Жлобінскую раёну за верасень чыгунка ўплаціла кліентам штраф за незабяспечэнне планавых заявак вагонамі 39.664 руб., а кліентура чыгунцы—35.697 руб.** Атрымліваецца сваіраблівая амністыя штрафамі, пераліванне дзяржаўных грошай з адной кішэні ў другую.

Начальнікі станцый, інструктарскі апарат раёна не прымяняюць правільнасці планавых заявак. Замест таго, каб выяўляць на месцы і правяраць рэальнасць заявак, начальнік прызавой часткі тав. **Пілілёнка** займаецца пісанінай.

Бываюць і такія выпадкі, калі асобныя начальнікі станцый падаюць вагоны для выплановых грузаў і гэтым самым зрываюць выкананне планавых заданняў. Так, 24 лістапада начальнік станцыі **Рагачоў** тав. **Жаркевіч** падаў 8 вагонаў для выплановай пагрузкі і гэтым самым сарваў падачу 14 вагонаў для планавай пагрузкі.

Да гэтага часу не ліквідаваны прастоі вагонаў пад пагрузкай. Асабліва адпачываецца бабруйскі лесахімбінат, які ў сярэднім за суткі пагружае да 15 вагонаў. 23 лістапада засталіся незагружанымі 12 вагонаў, 24 лістапада—19 вагонаў.

Змешчылася агульная пагрузка па раёну. У другой дэкадзе лістапада яна складала 386 вагонаў, у той час, як у першай дэкадзе лістапада —438.

Яшчэ горш з выгрузкай. У першай дэкадзе лістапада сярэдня-сутачная астача склала 48,5 вагонаў, або 22 проц. усёй выгрузкі, а ў другой дэкадзе 61 ці 25 проц. выгрузкі.

Не ліквідаваны факты «очковтирательства» з боку работнікаў станцыі, якія даюць у раённае кіраўніцтва нікаравільныя тэлеграмы пакоіт хата выгрузкі. Так, 18 лістапада станцыя **Бабруйск** паказвае, што не выгружан адзін вагон у сувязі з позным прыбыццём пяцка № 976. Тым часам у гэты дзень такога цягніка не было ў руху. Начальнік станцыі Бабруйск т. **Нацэўскі** і некаторыя іншыя работнікі імкнуцца ўтаіць сапраўдны стан пасіўнічэ з пагрузкай і выгрузкай і такім часта даюць неправільныя весткі. Тав. Нацэўскі наогул не ведае, што робіцца на станцыі. 24 лістапада ён даваў у раён весткі аб тым, што пагружана за суткі 8 вагонаў, у тым ліку тры з экспартнымі грузамі. Пры праверцы аказалася, што пагружана 34 вагоны, у тым ліку 16 з экспартнымі грузамі. Аказваецца, што Нацэўскі гэтымі данымі хацеў дабіцца ад раёна больш вагонаў пад пагрузку на другі дзень.

Палітадзел Жлобінскага раёна павінен прыняць меры, каб ліквідаваць гэту бюракратызасць і чохарду ў выкананні планаў пагрузачна-разгрузачных работ.

МАШНІЦКІ.

АБ ДАГАВАРАХ З КАЛГАСАМІ І СЯЛЯНАМІ-АДНААСОБНІКАМІ ДЛЯ ЛЕСАЗАГАТОВАК І СПЛАВА

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Соўнарком СССР адзначае, што органы Наркамлеса, а таксама краявыя і абласныя выканаўчыя камітэты да гэтага часу не забяспечылі перахода да арганізаванага набора рабочай сілы і цягі для дровалесазагатовак; між тым, зараз, калі калгасы заняті галоўнае мясоца ў вёсцы, правільная арганізацыя дагаворных адносін з калгасамі безумоўна можа поўнасцю забяспечыць патрэбнасць у рабочай сіле і цягле ўсіх лесапрамгасаў.

Адсутнасць сапраўдных двухбаковых гаспадарчых дагавораў леспрамгасаў з калгасамі, адсутнасць арганізаванай вярбоўкі немінуча прыводзяць да зрыву дровалесазагатовак па цэламу раду месц і не забяспечваюць патрэбнай увагі лесазагатовак з сельскагаспадарчымі работамі калгасаў.

Для таго, каб безумоўна забяспечыць усе лесазагатоўкі, вывазку і сплаў неабходнай рабочай сілай і цягай, поўнасцю гарантуючых выкананне квартальнага і гадавога планаў лесазагатовак, вывазе і сплава, Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

1. Абавязаць органы Наркамлеса, Саюзспрамцяжа, пясныя органы НКШЗ, урады саюзных і аўтаномных рэспублік, краявыя і абласныя выканкомы да 15 снежня арганізаваць і закончыць заключэнне памёк леспрамгасамі і калгасамі цвёрдых двухбаковых гаспадарчых дагавораў, у якіх дакладна ўказаць, якія дзялянкі прымацоўваюцца да дакага калгаса і на працягу якога часу ён павінен распрацаваць і вывазці адтуль лес.

Дагаворы павінны мець абавязковую юрыдычную сілу і дакладна прадугледжваць адказнасць абодвух бакоў за іх выкананне.

2. Абавязаць Наркамлес, а таксама ўрады саюзных і аўтаномных рэспублік, краявыя, абласныя выканаўчыя камітэты не пазней 25 лістапада давесці да кожнага раёна, сельсовета і калгаса канчатковы план загатовак і вывазкі IV квартала, а потым і план на ўвесь 1934 год па даному раёну. Пры гэтым неабходна забяспечыць, каб на працягу першага квартала 1934 года, г. зн. у зімовы, самы выгодны для калгасаў час, было-б вывезена не менш 75-80 проц. усяго гадавога плана.

3. Аплата працы па дагавору робіцца леспрамгасам на наступных умовах:

а) увесь грашовы заработак калгасніка (уключаючы аплату за работу каня) паступае ў распараджэнне калгасніка за выключэннем 20 проц., якія адлічваюцца ў распараджэнне калгаса за рамонт збруі, калёс, саней і г. д., а таксама аўса, які паступае ў распараджэнне калгаса для пракорма каня;

б) у тых выпадках, калі агульны расход калгаса вырашае аплачваць калгаснікам за работу ў лесе працаўдзнямі за кошт данага калгаса, увесь заработак калгасніка (уключаючы натуру) паступае ў распараджэнне калгаса, прычым леспрамгас, разам з праўленнем калгаса павінен дакладна ўстанавіць норму выпрацоўкі за працадзень.

Пры перавыкананні гэтай нормы выпрацоўкі калгаснікам аплата за перавыпрацоўку поўнасцю паступае ў асабістае распараджэнне калгасніка.

І ў тым і ў другім выпадку адказнасць за выкананне прынятых калгаснікаў абавязацельстваў па загатоўцы, сам абавязацельствам па вывазцы і сплаву леса поўнасцю кладзецца на праўленне калгаса;

в) абавязаць НКЛес забяспечыць гаўстанобленых нормах і кантынгентах леспрамгасаў выдачу хлеба, круп і аўсавячасовую выдачу НКСнабу СССР заказ і прапанаваць НКСнабу СССР забяспечыць свячасовую адгрузку прамысловых і іншых тавараў (цукор, масла, махорка, чай, рыба).

4. Праўленне калгаса выдзяляе на лесараспрацоўкі спецыяльныя брыгады, якія адказваюць не толькі за рубку, але і за вывазку леса (перавазку, але і за вывазку леса (перавазку, на сувазныя брыгады) і ўзначальваюць спецыяльным калгасным брыгадзірам, атрымліваючым ад леспрамгаса пры перавыкананні месячнай праграмы звыш асноўнага заработка брыгадзіра каля 2 проц. да аб'ёма заработка ўсёй брыгады.

5. Пры заключэнні дагавора з калгасам леспрамгас павінен побач з заробкам свячасовай і поўнай выплачэннем свячасовай і поўнай выплаты дачы зарплаты і прадуктаў таксама прадугледзець дакладна аказаную дапамогу калгасам пясными матэрыяламі, дровамі, выдзяленнем прыватаваў, трактарамі і рамонтам сельсна-гаспадарчых машын, аказаннем канкрэтных культурна-бытавых паслуг і г. д.

6. З прычыны выключна важнага значэння работы пастаўленых кадраў самога леспрамгаса, якія павінны забяспечыць выкананне асноўнай часткі праграмы і другім кварталах (калі мы і другім і трацім кварталах (калі асноўная маса калгаснікаў занята ў сельскай гаспадарцы), Соўнарком СССР абавязвае Наркамлес у месячны тэрмін разам з краявымі выканаўчымі камітэтамі вызначыць, колькі па кожнаму леспрамгасу патрэбна пастаянных рабочых, забяспечыўшы іх поўнае камплектаванне не пазней 1 сакавіка 1934 года.

Побач з гэтым даручыць НКЛесу, разам з УсесЦСПС прадставіць у двухдзённы тэрмін у Соўнарком СССР спас прапановы па ўпарадкаванню зарплаты (у першую чаргу здзельшчыны), па павышэнню аплаты дзесятнікам і брыгадзірам, а таксама па паляпшэнню матэрыяльна-бытавых умоў для пастаянных кадраў рабочых леспрамгасаў (у прыватнасці, прадастаўленне кватэр для сямейных, дапамога ў набыцці дроў, стварэнне індывідуальных агародаў, пытанні харчавання, паляпшэння спажывання і г. д.).

7. Сілоне—адзіноабінкі прыцягваюцца на работу ў лесе на аснове індывідуальных дагавораў пры правядзенні сярод іх масавай растлумачальнай работы і самаабавязацельствам. Пры арганізацыі брыгад леспрамгасамі з адзіноабінкаў брыгадзіры намічаюцца дзеяцтнікамі і зацвярджаюцца заг. лесапунктам.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Нам. кіраўніка справамі Совета Народных Камісараў Саюза ССР Г. ЛЕПЛЕЎСКІ.

Масква, Кремль, 19 лістапада 1933 г.

АБ АСЕННЯ-ЗІМОВЫХ ДРОВАЛЕСАЗАГАТОЎКАХ І ВЫВАЗЦЫ 1933-34 г.

Пастанова Совета Народных Камісараў І ЦК КП(б)Б ад 6 лістапада 1933 г.

Надаючы вялізарнейшае гаспадарча-палітычнае значэнне свячасоваму забеспячэнню прамысловасці і будаўніцтва лесаматэрыяламі, колькасному і якасному выкананню лесазакспартнага плана, забеспячэнню Данбаса крапежным лесам, фабрык, заводаў і прамысловых цэнтраў палівам,—Совет Народных Камісараў і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Устанавіць праграму па трэсту Лесбел на 1934 г. у аб'ёме: загатоўка строя 4.300 т. км., вывазка 4.450 т. км.; загатоўка дроў 4.992 т. рм., вывазка —5.148 т. рм.

2. Улічваючы, што першы квартал з'яўляецца асноўным і рашаючым па выкананню лесазагатоўчых работ і для ўвязкі лесазагатовак і вывазкі з с.-г. работамі ў веснавы і летні перыяд, устанавіць наступную праграму 1-га квартала:

На загатоўцы строя	3.300 т. км., або	76,7 проц.	да гадав. задання	
„ „ дроў	2.635 т. рм	„ 52,7 проц.	„	„
На вывазцы строя да канч. пункта	3.560 т. км.	„ 80,0 проц.	„	„
На вывазцы дроў да канч. пункта	770 т. рм.	„ 58,8 проц	„	„
На падвозцы строя да ляжнёвак	100.0 т, км.	„ 2,2 проц.	„	„
На падвозцы дроў да ляжнёвак	400,0 т. рм.	„ 7,7 проц.	„	„

3. Для забеспячэння і поўнага выканання плана IV квартала, свячасовай падрыхтоўкі і выканання плана і квартала 1934 г. як па колькасных, так і па якасных паказчыках вызначыць патрэбнасць рабочай і гужавой сілы для выканання праграмы IV квартала 1933 г. у 875 тыс. чалавекадзён і 1.405 тыс. конядзён, для 1 квартала 1934 г. — 2.530 тыс. чалавекадзён па загатоўцы і 3.950 тыс. конядзён па вывазцы і падвозцы.

4. Улічваючы наяўнамернасць размер кавання задання па дровалесазагатоўках і вывазцы па асобных леспрамгасах і раёнах, у сувязі з геаграфічным размяшчэннем лясоў, замацаваць за адпаведнымі раёнамі, больш загружанымі праграмай дровалесазагатовак і вывазкі, рабочую і гужавую сілу з іншых, менш нагружаных раёнаў.

Даручыць камісіі пры СНК БССР па вярбоўцы рабочай сілы сумесна з упаўнаважаным Наркамлеса на працягу 5-ці дзён размеркаваць патрэбную колькасць рабочай і гужавой сілы на дровалесазагатоўкі і вывазку па асобных раёнах, прадугледзеўшы таксама лепшае скарыстанне яе па сельсоветах і раёнах сумежных раёнах.

5. Даручыць [illegible] абеззі. Розіну і дырэктару тав. ШАПІРА на працягу 5-ці [illegible] сіцць леспрамгасам і РВК канкрэтны план дровалесазагатовак і вывазкі на 1934 г. і асобна на першы квартал з указаннем асартыментаў і тэрмінаў выканання ў месячным разрэзе, узяўшы асноўны ўпор на першыя два месяцы 1 квартала 1934 года.

6. Прапанаваць РВК, РК КП(б)Б сумесна з леспрамгасамі побач з праверкай давядзення плана IV квартала да вёсак, на працягу 15 дзён па атрыманні планаў і квартала 1934 г. давесці іх да кожнага прарабскага ўчастка, сельсавета, калгаса з указаннем: агульнай масы для загатоўкі і вывазкі дроў і строя (па галоўнейшых асартыментах) і канкрэтных тэрмінаў іх выканання, месца работ, адлегласці вывазкі-падвозкі і дзённай нормы выпрацоўкі.

7. Асноўнай формай арганізацыі працы ў лесе павінна быць сказная брыгада, якая выконвае адначасова загатоўку, падвозку і вывазку драўніны, прычым кожнай брыгадзе або групе брыгад вызначацца адпаведны ўчастак лесасекі (квартал, дзялянка і інш. адзінка), якая павінна выканаць усе прадугледжаныя дагаворам работы ад пачатку да канца і ва ўстаноўленыя тэрміны ў колькасным і асартыментным разрэзе.

8. Прапанаваць сельсоветам сумесна з апаратам леспрамгасаў размеркаваць усю наяўную па сельсоветах працаздольную рабочую гужавую сілу як па калгасах, так і сярод адназасобнікаў (за выключэннем кулацка-заможнай часткі, якой даводзіцца цвёрдае заданне) на адпаведныя брыгады па іх кваліфікацыі і прыстасаванасці да тых ці іншых лесазагатоўчых работ (склад брыгад, прыкладна, 15-20 возчыкаў і 10-12 лесарубаў).

Вызначаныя для калгасаў заданні па дровалесазагатоўках і вывазцы ўвязаць і ўключыць у іх агульны вытворчы план асенняга-зімовых работ.

9. Прапанаваць старшыням сельсоветаў і калгасам разам з прарабамі вызначыць на чале кожнай брыгады палітычна-правераных брыгадзіраў, якія адначасова з непасрэднай работай у брыгадзе з'яўляюцца арганізатарамі работ і адказнымі за нармальны ход работы сваёй брыгады.

10. Даручыць упаўнаважанаму Народнага камісарыята лясной прамысловасці тав. Розіну, дырэктару Лесбела тав. Шапіра, БРК саюза леса і сплава тав. Эльперыну на працягу 5 дзён распрацаваць і спусціць леспрамгасам, РВК і РК саюза, сельсоветам і калгасам інструкцыю аб ролі брыгадзіра, яго правах і абавязках, формы аплаты яго працы, метады арганізацыі гаспадарча-разрахунковых брыгад і стымулявання іх за дэтэрміновае і лепшае выкананне за даданяў.

11. Прапанаваць сельсоветам вызваліць адзнаго з членаў прэзідыума сельсовета, адказнага за лесазагатоўкі, лесавывазкі па сельсовету для спецыяльнай [illegible] заключэнне дагавораў з калгасамі і брыгадамі калгаснікаў і адназасобнікаў на IV квартал 1933 г. і на I квартал 1934 г. не пазней 15 лістапада 1933 г.

14. Прапанаваць РВК, ГК КП(б)Б, дырэктарам леспрамгасаў і райкомам саюза леса і сплава забяспечыць арганізацыю прапрацоўкі вытворчых заданняў па дровалесазагатоўках і вывазцы па сельсоветах, калгасах, паселішчах і аказаць дапамогу леспрамгасам у заключэнні гаспадарча-падрадных і індывідуальных дагавораў, для чаго камандіраваць на месцы адказных кіруючых работнікаў раёна.

15. Даручыць начальніку палітсэктара НК Земляробства тав. Ратнеку даць адпаведныя ўказанні палітаддзелам аб удзеле і дапамозе іх у рабоце па лесазагатоўках і вывазцы.

16. Абавязаць трэст Лесбел (тав. Шапіра) разам з БРК саюза і райкомамі саюза, а таксама дырэктарам леспрамгасаў:

а) да 20 лістапада адрамантаваць і скончыць пачатыя будовай жылыя дамы, баракі, пазні для рабочых, а таксама стайні для конскага транспарта; палепшыць жыллёвыя ўмовы рабочых адпаведным абсталяваннем (тапчаны, матрацы, кіпяцільнікі, чайнікі і г. д.), забяспечыць свячасовы наём памяшканняў у калгасаў і сялян (у тых мясцах, дзе няма ўласных памяшканняў калгасаў) і прыстасаваць іх для размяшчэння прывозных рабочай і гужавой сілы з іншых раёнаў;

б) забяспечыць свячасовы завоз на месцы работ патрабнай колькасці харчовага фуража і прамтавараў, адкрыць дадатковыя крамы і паркі (з 94-х давесці да 550), сталоўні (з 15 давесці да 190), і чайныя (з 25 давесці да 50). Арганізаваць развозку ў тэрмасах гарачай стравы на дзялянкі, рымы і інш., з мэтай найлепшага абслугоўвання рабочых лесарубаў і возчыкаў. Устанавіць найстражэйшы ўлік і кантроль за правільным хаваннем, скарыстаннем і расходаваннем харчфуражных і прамтаварных фондаў;

в) не пазней 16-XI г. г. пінвідаваць цяжкам грашовую запазычанасць сялянству за праведзеныя ўжо работы па дровалесазагатоўках і вывазцы і ў далейшым забяспечыць рэгулярную і свячасовую расплату з лесарубамі і возчыкамі строга ў тэрмін, прадугледжаны дагаворамі, і ні ў якім разе не дапускаць запазычанасці.

Даручыць РКК-РСІ праверыць становішча расплаты леспрамгасамі і ашчадкасамі з лесарубамі і возчыкамі, прыцягнуўшы да найстражэйшай адказнасці вінаватых у затрыманні выплаты;

г) на працягу IV квартала бягучага года арганізаваць і замацаваць на пастаянную работу ў 1934 г. не менш 6 тысяч пастаянных лесарубаў і 12.000 возчыкаў, стварыўшы для іх перавазны і стымулюючыя ўмовы працы;

д) забяспечыць арганізаваную і свячасовую перакідку рабочай і гужавой сілы з аднаго раёна ў другі (згодна вызначаных планаў) і ўнутры раёнаў, а таксама арганізаваць правільную расстаноўку і скарыстанне яе;

е) на працягу аднаго месяца перагледзець склад нізавога адміністрацыйна-тэхнічнага персанала, очысціць яго ад класава-чужых элементаў, узмацніць апарат лепшымі, палітычна праверанымі, кваліфікаванымі работнікамі, стварыўшы для іх належныя ўмовы працы (кватэра, снабжэнне, аплата), ацэнкі на ўвазе, што асноўным заданнем, вырашаючым колькасне і якасне выкананне лесазагатоўчага плана, правільную арганізацыю працы, павышэнне прадукцыйнасці працы і зніжэнне сабекошта з'яўляецца вытворчы ўчастак (прараб, дзесятнік).

Катэгарычна забараніць усім РК КП(б)Б і РВК на час асенняга-зімовай вывазкі адрываць работнікаў лясного апарата на выкананне іншых работ.

17. Даручыць ЦСПС і камісіі па арбоўцы рабочай сілы пры СНК сумесна з Упаўнаркамлеса вынайсці спецыялістаў у лясной прамысловасці, працуючых у іншых арганізацыях і ўстановах не па спецыяльнасці з тым, каб шляхам правядзення шырокай растлумачальнай работы дабіцца пераходу іх на работу па спецыяльнасці ў леспрамгасы. Прапанаваць адпаведным арганізацыям і ўстановам, дзе працуюць гэтыя спецыялісты не па сваёй спецыяльнасці, забяспечыць перакідку гэтых спецыялістаў.

Даручыць т. т. Кавальчуку і Галоўда высветліць у саюзных органах, у чым канкрэтнасцю пераданы пытанні рэгулявання працы спецыялістаў пасля зліцця Наркампрацы з УсесЦСПС.

18. Абавязаць Лесбел і НК Аховы Здароўя неадкладна заключыць дагавор аб [illegible] медабслугоўвання [illegible]

[illegible] веткіраўніцтва НК Земляробства забяспечыць ветабслугоўванне як упаўнага абоза леспрамгасаў, так і сляпіных коняй, якія будуць працаваць у лесе.

19. Абавязаць ЦП саюза рабочых лесасплава [illegible] і НК Асветы [illegible] 5-ці [illegible] цаваць канкрэтныя мерапрыемствы [illegible] культурна-масавай рабоце на лесазагатоўках (клубы, чырвоныя куткі, хаты-чытальні, кіно, радыё, тэатр, агітпаход і г. д.), прыстасоўваючы формы і метады культурна-масавай работы для вышэйшага абслугоўвання лесарубаў і возчыкаў.

20. Даручыць Культпропу ЦК КП(б)Б і ўпаўнаважанаму Народнага камісарыята лясной прамысловасці сумесна з ЦП саюза рабочых леса і сплава на працягу 10 дзён устанавіць дадатковую колькасць шматтыражак з такім разлікам, каб абслугоўваць буйнейшыя леспрамгасы.

21. Абавязаць старшынь РВК забяспечыць свячасовае распланаванне і перакідку рабочай і гужавой сілы як унутры раёнаў, так і ў іншыя сумежныя раёны, згодна плана камісіі пры СНК па рэгулёванню рабсілы, і ўстанавіць пастаянны нагляд за ходам выканання вызначаных ім заданняў па дровалесазагатоўках і вывазцы. Устанавіць жорсткі нагляд за поўным і свячасовым выкананнем цвёрдых заданняў кулацка-заможнымі гаспадарнямі, вядучы рашучую барацьбу з усялякімі праяўленнямі кулацкага сабатажа, накіраванага на зрыў лесазагатовак.

22. Даручыць ЦКК-РСІ і райКК-РСІ ўстанавіць пастаянны нагляд за выкананнем гэтай пастановы і за ходам выканання праграмы па дровалесазагатоўках і вывазцы.

23. Абавязаць рэдакцыю газеты «Звязда» і рэйонны друк сістэматычна асвятляць на старонках сваіх газет ход асенняга-зімовага [illegible] лесазагатовак і лесавывазкі, [illegible] адпаведныя посты і райды ў рашаючых леспрамгасах і раёнах.

24. Папярэдзіць сакратароў РК КП(б)Б і старшынь РВК, што пытанню дровалесазагатовак і вывазкі, як адной з важнейшых гаспадарча-палітычных задач, павінна быць аддана вынікоўная ўвага і што за свячасовую падрыхтоўку і выкананне плана асенняга-зімовых лесазагатоўчых работ яны нясуць адказнасць, як і дырэктары леспрамгасаў.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР папярэджваюць трэст Лесбел і дырэктароў леспрамгасаў, што выкананне плана асенняга-зімовых лесазагатовак і вывазкі павінна быць забяспечана шляхам карэнных перабудоў ўсёй работы трэста Лесбел зверху да нізу, рашучай барацьбы з эстаткамі класава-варожых элементаў і на аснове шырокага разгортвання соцыяльнага спаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых, ІТР і служачых дабіцца поўнага і свячасовага выканання планаў па колькасных і якасных паказальніках.

Адказны [illegible] і друкарні „Звязда" (Совецкая, 63, уваход са двара).

СУПРОЦЬ СКАЖЭННЯ ПАЛІТЫЧНАГА ЗНАЧЭННЯ ЧЫСТКІ ПАРТЫІ

Беларуская Акадэмія Навук з'яўляецца цэнтрам навуковай думкі БССР, адным з адказнейшых участкаў культурнай рэволюцыі, развіцця культуры сацыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме. Як навуковы цэнтр БелАН мае сваёй мэтай усямернае развіццё навукі, пастаўленай на службу сацыялістычнаму будаўніцтву і барацьбы з усякімі клясна-навуковымі тэорыямі, накіраванымі на зрыў пашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Адсюль зусім ясна, якое значэнне мае чыстка партарганізацыі БелАН. Камісія па чыстцы скажа сваё аўтарытэтнае партыйнае слова аб тым, як парторганізацыя БелАН здолела сама мабілізавацца і мабілізаваць масы на выкананне задач, пастаўленых перад БелАН партыяй.

Аднак, яшчэ да скажэння чысткі некаторыя таварышы прабуюць скажаць сапраўднае становішча рэчаў і даваць няправільную ўстаноўку ў справе аднэй чысткі і не вынікаў.

У газеце «За пролетарскую навуку»—органе бюро парткалектыва, прэзідыума і мясцкома БелАН (№ 28-45 ад 19-XI 33 г.) надрукаван перадавы артыкул «Некаторыя ўрокі чысткі». Амаль усе пытанні чысткі пастаўлены ў гэтым артыкуле на галаву.

Аспоўнае пытанне, пытанне аб загартаванасці парткалектыва БелАН у справе ажыццяўлення генеральнай лініі партыі на сваім участку у перадавым зусім абыходзіцца, як быццам чыстка нічога не выявіла наконт гэтага.

Як асобныя члены партыі—навуковыя працаўнікі выконвалі дырэктыву партыі—быць на вышыні навукі, авладаць яе вышынямі і накіраваць на службу сацыялістычнаму будаўніцтву? Перадавы дае вельмі дзіўны адказ на гэта пытанне: «Чыстка ўжо зрабіла відавочным наяўнасць у Акадэміі пэўнай колькасці навуковых працаўнікоў комуністаў, якія настойліва і ўпарта працуюць, якія даюць значную навуковую прадукцыю. Праўда, некаторыя з іх часамі робяць памылкі, нават грубыя памылкі, але ў сваёй далей

УСЕБЕЛАРУСКІ ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ т. ГІКАЛО

ЗАВОД „УДАРНІК“ АПРАЎДВАЕ СВАЮ НАЗВУ

ПОСПЕХ У ВЫТВОРЧЫМ ПАХОДЗЕ ЗАБЯСПЕЧАН ТАМ, ДЗЕ НА БАРАЦЬБУ ЗА ПЛАН ПРЫВЕДЗЕНЫ Ў РУХ УСЕ ВАГАРЫ ТВОРЧАГА ЭНТУЗІЯЗМА

ЗАВОД НА УЗДЫМЕ

Завод «Ударнік» (Менск) уключыў ся ва Усебеларускі масавы паход імя Гікало. Рабочым завода абавязаліся выканаць прамфінплан 4 квартала да 5 снежня з тым, каб добра падрыхтавацца да сустрэчы другога года другой пяцігодкі.

У гэтым напрамку зараз праходзяць моя работа на заводзе. Адчуваецца падём, значна ўзрасла творчая актыўнасць усяго рабочага калектыва. Змянілі сваю работу партыйныя і прафсаюзныя групы, цэхі, брыгады, лікі пашыры да кожнага рабочага. Правядзена вялікая масава-растлумачальная работа вакол задач, якія стаяць перад усёй грамадскасцю горада ў часе пахода. Таму не дзіва, што былыя лодыры і прагульшчыкі ганоснага зараз ударнікамі. Нават ці, якія ўключыліся ў паход рабочы Маскоўскі (бакоменны цэх) заставаўся лодырам-бракаробам. Зараз Маскоўск. пачынаючы сваю рабочы дзень і дае прадукцыю добрай якасці.

Такая рабочага, малярнага цэха Суднікова ўесь завод ведаў, як лодыра, сымулянта, прагульшчыка. Зараз ён узняся прафгрупа і калі Суднікова выкінулі на заўком, ён даў слово пранаваць добрасумленна. Зараз Суднікаў не той. Не бывае такіх фактаў, каб рабочыя прастойвалі з-за несвачасовай падачы Суднікавым дэталей і інш.

На заводзе шырокая пастаўлена тэхнічная вучоба. Зараз працуе 5 тэхнічных гурткоў, па спецыяльнасцях (слесароў, весаўшчыкоў, штамповачнікаў, ліцейшчыкаў і інш.). У гэтым годзе гурток вывучэнні 10 чалавек весаўшчыкоў, якія добра авладалі сваім працэсам вытворчасці.

Старыя рабочыя шэфствуюць над маладымі. Так, у жніўні месяцы на завод прыбыла на работу брыгада фабзавучнікаў. Іх паставілі на работу ў бакоменны цэх. Дрэнна працавалі Латвін, Пасомкоўскі, Чартоп, Красільчыкі і інш. Стары рабочы тав. Ярошэвіч шэфствуе над гэтай брыгадай. І зараз яны добра авладалі тэхнікай свайго працэса. Яны не даюць брака. Калі раней яны рабілі ў дзень 6-7 бракованых, то зараз выробляюць 17.

Характэрным прыкладам з'яўляецца шэфства старога рабочага Алешка над маладымі рабочымі Врублеўскім і Бязручка (штамповачны цэх). Алешка, узяўшы над імі шэфства, паставіў сваёй мэтай навучыць маладых рабочых тэхніцы вялікага штамповачнага проса (замежнай канструкцыі). З усёй старанасцю т. Алёшка расказваў сваім падшэфным, як трэба абыходзіцца з варштатам, як з ім працаваць. Зараз Врублеўскі і Бязручка добра вывучылі вялікі штамповачны прэс, які выробляе асноўныя дэталі для ўсяго завода, і ўжо самастойна на ім працуюць.

Раней мелі месца прастоі паасобных цэхаў з-за несвачасовай падачы дэталей іншымі цэхамі. Бляшаны цэх

Тав. Розава — брыгадзір паніровачнай брыгады апрацоўчага цэха завода імя Молатава. Сістэматычна перавыконвае свае прамфінплан. Лепшая ўдарніца завода.

працягвў соцыялістычны рахунак штамповачнаму цэху на сваячасовы і добракасны выраб дэталей. У выніку гэтага за апошні час не было прастояў з-за адсутнасці дэталей.

Усё гэта з'яўляецца рэзультатам узросшай творчай актыўнасці ўсяго рабочага калектыва завода. Сваю вытворчую праграму за 10 месяцаў завод выканаў на 106,4 проц. Астаўшыяся да канца года час трэба так скарыстаць, каб прыйсці да другога года другой пяцігодкі з яшчэ лепшымі паказальнікамі па выкананню прамфінплана. Узросшую актыўнасць рабочых трэба замацаваць, шырока разгарнуўшы спаборніцтва і ўдарніцтва сярод цэхаў, брыгад, паасобных рабочых, правільна расставіўшы рабочыя сілы. Тады перамога будзе забяспечана.

Я. Гарлоўскі.

ГУЧНЫЯ ФРАЗЫ І РЭЧАІСНАСЦЬ

Тэмпература ў топкай печы пікла-завода імя Домбаля ў лістападзе пачала рэзка спадаць. Ад гэтага і атрымліваецца такая маса, з якое па суды не зробіш. Прыходзяць рабочыя-пікладчыцы на працу, паглядзяць у пічыліны печы, а потым сядзяцца на верстаці і даюць анекдоты расказваць — маса нішчуды негодная. А працаваць усё паглыбляецца. У кастрычніку вытворчае задание было выканана на 96,9 проц., а ў першай дэкадзе лістапада толькі на 72,3 проц. У другой дэкадзе завод працаваў яшчэ горш.

— Дровы нас замучылі, — гаворыць сакратар парткома Качальчук. Спытаўшы два варштаты. Усё-ж з-за дроў. Прывязуць возіж, ну, мы яго як расхват. Пройдзе гадзіна, палы і потым зноў перабой...

Не паспеў сакратар скончыць сваё нудное апавяданне, як у памяшканне ўскочыў старшыня заўкома Якаўлеў і выпаліў:

— Я не магу. Завод не адпыляецца. Я, як старшыня заўкома, павінен абараняць інтарэсы працоўных, таму трэба вываляць ад работы рабочых да прыбыцця выстарчальнай колькасці дроў.

Так і не ўдалося ў кіраўнічай высветліць сапраўдныя прычыны адставання завода. Прыйшлося пайсці ў цэх. Майстар Каспяровіч аб рабоце завода гаворыць усхвальвача. Ён злуе, паказваючы жэстам рукі на кантору, заўком, парткамітэт.

— Завод без дроў. Яны знаходзяцца па адлегласці двух кілометраў. Але заводскія арганізацыі не могуць палапіць дастаўку дроў на завод. За воду штодзенна патрэбна 40 тон дроў. У нас ёсць два трактары-цягачы, якія могуць арабіць тры рэйсы ў дзень і даставіць заводу каля 45 тон дроў. Даставляюць-жа яны 12-13 тон. Ёсць у нас тры аўтамашыны і 40 коняй. А дроў няма. Чаму? справа ў тым, што ў далёкаўсходнім пацвор'е на дварэ праз, вольга вылезці, буксуюць машыны. Цяпер праз самёрзла, груды не даюць магчымасці прайсці машынам. Аб тым, што двор трэба было забрукаваць, рабочыя гаварылі яшчэ вясной, але дырэктар Шулыгін заўсёды адказваў:

— Гэта дробязь. Ёсць больш важныя справы.

— Вось і атрымалася, што да галоўнага корпуса завода няма магчымасці пад'ехаць, — гаворыць далей Каспяровіч. — Апрача праз'ез на дварэ не дае магчымасці праехаць гатовая прадукцыя. Яе па дварэ ляжыць каля 60 вагонаў. З восені стаялі экспартныя стаканы на дварэ. Іх дождж напоўніў вадой. А з наступленнем марозаў вада ў стаканах пачала замярзаць, стаканы палопаліся. Хіба гэта не шкодніцтва.

Заводскія арганізацыі не вядуць выхаваўчай работы ў цэху. Мала зроблена ў справе барацьбы з браком. Асобныя брыгады сістэматычна выпускаюць бракаваную прадукцыю. Замест планавых 4 проц. боя, брыгада Празноўскага дае 30 проц., Жахоўскага — 20, Мальцэўскага — 18 проц., рабочых не вучаць працаваць па варштатах.

Аб тэхвучобе расгаворыў на заводзе было нямала, асабліва ў сувязі з вытворчым паходам імя тав. Гікало. Але далей размоў не пайшлі. Тэх гурткі арганізаваны ў варачным і газагенератарным цэхах, але рабочых ахопнута мала. Заняткі часта зрываюцца. Па варачному цэху заняцалася 25 чалавек, а наведвае 5-8. Між тым, склад рабочых завода на 75 проц. новы, з вытворчымі працэсамі не знаёмы.

Напрабуйце даведацца, колькі і якой прадукцыі паявнен даць цэх, брыгада, рабочы ў месяц, дэкаду і вы гэтага нідзе не даведаецеся. У гаспадарча-разрахунковых брыгадах няма вытворчых планаў.

На пікзаводзе ёсць планавік Сілін. Ён усю віну за адсутнасць планаў усвальвае на сакратароў парт'ячэек. Сілін, лічачы, што ў брыгадах планы «скураць», не знайшоў метада давядзення планаў да брыгад. А заводскім арганізацыям, відаць, не было часу заняцца планавай «пробязю». Яны дэкларуюць уключэннем у масава-вытворчы паход імя т. Гікало—выканаць план. арганізаваць тэхвучобу. Але ўсё гэта толькі гучныя фразы. Да бачной, большэвіцкай работы на паходу на заводзе яшчэ не прыступілі.

Д.

У МСЦІСЛАЎСКІМ, ГОРАЦКІМ, ДУБРОВЕНСКІМ І СУРАЖСКІМ РАЁНАХ КУЛАЦКІ САБАТАЖ ІЛЬНАЗАГАТОВАК ЯШЧЭ НЕ ЗЛОМЛЕН

КОЖНАМУ СЕЛЬСОВЕТУ, КАЛГАСУ, ВЁСЦЫ І АДНААСОБНАМУ ДВАРУ ШТОДЗЕННАЕ ЗАДАННЕ ПА АПРАЦОЎЦЫ І ЗДАЧЫ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ

Зводка аб ходзе загатовак ільнапрадукцыі

(У процантах на 25 лістапада 1933 г.)

РАЁН	Загатоўлена ільнавалакна	Загатоўлена ільнасемя
1. ДРЫСЕНСКІ	75,6	99,8
2. СЕННЕНСКІ	57,0	101,4
3. ПОЛАЦКІ	52,2	101,9
4. УШАЦКІ	30,4	81,7
5. ШКЛОЎСКІ	28,0	95,0
6. БЯЛЫНІЦКІ	26,3	77,9
7. БЕШАНКОВІЦКІ	25,2	100,2
8. АСВЕЙСКІ	24,8	85,0
9. ЛЁЗНЕНСКІ	24,1	78,2
10. ГАРАДОЦКІ	22,2	100,1
11. ЛЕПЕЛЬСКІ	21,8	79,5
12. ТАЛАЧЫНСКІ	18,9	21,8
13. РАСОНСКІ	17,7	92,1
14. ЧАШНІЦКІ	17,0	94,5
15. КРУПСКІ	16,2	77,3
16. СІРОЦІНСКІ	15,6	87,4
17. ЧАВУСКІ	15,0	74,3
18. СУРАЖСКІ	12,9	89,7
19. ДУБРОВЕНСКІ	11,4	85,6
20. ГОРАЦКІ	9,7	83,9
21. МСЦІСЛАЎСКІ	9,2	85,6
РАЗАМ ПА ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАХ	25,2	87,7
УСЯГО ПА БССР	21,5	81,4

Чорная дошка

зрыўшчыкаў пераапрацоўкі і загатоўкі ільну

За зрыў пераапрацоўкі і загатовак ільнапрадукцыі на ўсебеларускую чорную дошку заносяцца наступныя раёны:

Горацкі (сакратар РК КП(б)Б **Вільчак**, старшыня РВК **Лабанаў**).

Дубровенскі (сакратар РК КП(б)Б **Кацман**, старшыня РВК **Сямашка**).

Крупскі (сакратар РК КП(б)Б **Штэйнгардт**, старшыня РВК **Скараход**)

Мсціслаўскі (сакратар РК КП(б)Б **Тарасаў**, старшыня РВК **Марон**).

Суражскі (сакратар РК КП(б)Б **Аўдзейчыкаў**, старшыня РВК **Русак**).

Чырвонапольскі (сакратар РК КП(б)Б **Лапацін**, старшыня РВК **Наровенка**).

ГІНЕ ЛЁН—ЗНІЖАЕЦЦА КАЛГАСНЫ ПРАЦАДЗЕНЬ

ТАЛАЧЫН, 25. (Ад ваш. спецкора).

Вялікае ільнянае поле калгаса «Чырвоны Коханавец» пакрыта снегам. І не толькі поле,—на плошчы ў 40 га пакрыты снежным абрусам, не вывезены са спеліна лежыць лён.

Гівуць калгасныя пранадні, гне кашгоўнейшая прадукцыя, а старшыня калгаса Сяргееў, спакойна седзячы за сталом, чухае рукою спіну і гаворыць:

— Чаго спяшаць? Зіма яшчэ не скора...

Сяргееў у Талачынчыне не адзін. Падобных па яго нямала. І таму: на 20 лістапада план здачы дзяржаве ільну—у 28.200 цэнт. трасты і 3.000 цэнтн. валакна—выканан толькі на 12 проц.

Гэта—колькасць. А якасць?

— О, у нашым раёне,—гаворыць намеснік загатчыка канторы «Загатлён» тав. Метрык, — ёсць сельсоветы—Круглянскі, Коханаўскі, Ваўковішкі, Пераваложы і яшчэ шмат іншых, у якіх лён па дзіва расце... Ніжэй 18-20 нумара ніхто не здаваў раней...

— А зараз?

— Зараз вышэй 4-6 нумара не здаюць...

— Як гэта? Можа ранейшая глеба спаўола куды ў другі раён?

На гэты раз, з выгадам «спеца» спяшаецца растлумачыць старшыня Кручанскага сельсовета Шаціла:

— Лён ракаўчына паела... Дажджы...

— А можа недаглядзілі?

— Каго? Паселі на добрай зямлі, адкасных вылучылі, усё як належыць.

— А калі сеялі?

— Капчалі сеяць у... ліпені...

Адну з прычын Шаціла сказаў. Аб астатніх давядзецца сказаць за яго.

У калгасе «Набат» (старшыня Баранда), Азерыцкага сельсовета, прапачні на пераапрацоўцы ільну налічваюцца толькі за колькасць; у калгасе «Чырвоная зара», Палюдаўскага сельсовета, з 40 жанчын на пераапрацоўку ільну выходзіць толькі 10; у калгасе «Комунар» і ў значнай частцы іншых за дзень патрапваюць толькі па 4 фунты ільну.

Асноўнай-жа прычынай недапушчальна марудных тэмпаў загатовак ільну з'яўляецца просты, адкрыты кулацкі сабатаж гэтай важнейшай справы.

Возьмем калгас «Вална», Круглянскага сельсовета. Там старшыня калгаса Жураўлёў, да рочы «комуніст», арганізаваў укладку трасты ў гумнах так, што другі нумар пайшоў уніз, а зверху—ды здачы—складзена «нулёўка», брак.

Калгас «Маяк» павінен здаць 253 цэнтн. трасты, а здаў толькі 46, прычым вельмі нізкай якасці. Старшыня гэтага калгаса Кузьмін ужо некалькі раз выклікаўся ў Круглянскі ільназавод, атрымліваў указанні, як трэба падрыхтоўваць трасту, каб павысіць яе якасць. Аднак, карысці ад гэтага мала. Калгас па-ранейшаму здае... смецце. І гэта не выпадкова. Кузьмін толькі ўхмыляецца:

— Вучаць... Хто іх будзе слухаць? Хіба мы не ведаем, што на заводзе прыймаецца план: нічога не зрабіць, прымуць...

Яшчэ горш справа па аднаасобным сектары: члены сельсветаў бяднейшчаюць, а аднаасобнікі тым часам лён чэшуць і прадуць для сваіх патрэб (в. Лясное, член сельсовета Башлыкоў і інш.).

Вось у чым сапраўдныя прычыны адставання...

— Якое адставанне?—здзіўляецца той-жа чыноўнік з «Загатлён» Метрык:—хіба мы адстаем? Мы-ж не апошнія ў БССР, ёсць і горшыя за нас...

Да рочы, гэты ўра-алтымістычны «загатоўшчык» не саромеца зараз жа, пасля абразы, за адставанне зусім у іншым тоне гаварыць:

— Трэба сказаць проста, па-большэвіцку—як-бы мы ні стараліся, з свой раённы план не выканаем...

Вось яны, перспектывы талачынскага «большэвіка» з канторы «Загатлён». Вось якім «працоўтвам» займаюцца талачынскія ільназагатоўчыкі замест канкрэтнай дапамогі калгасам па аўладанню тэхнікай апрацоўкі ільну! А вось і рэзультаты іх «работы»: 25-га кастрычніка сакоды нумар здаванага валакна быў 83, 5 лістапада—7,7, а 20 лістапада—з'ехаў па 7.

Паказальнік якасці падае ўніз, но лепш і з колькасным паказальнікам, а ў канторы «Загатлён» спакойныя словы:

— Хіба-ж мы адстаем?...

ВІТ. ДАЛЬ.

„ГЕРОІ“ ЧОРНАЙ ДОШКІ

СУРАЖ. Ільназагатоўкі ў раёне знаходзяцца пад лютай пагрозай зрыва. На 20 лістапада загатоўлена ільнатрасты 878 цэнтн.—10,7 проц., ільнавалакна 316 цэнтн.—6,6 проц.

— Няма людзей, няма з кім павярнуцца,—тлумачаць такое становішча ў райкоме і райвыканкоме.

Няпраўда. Людзей хапае, але ўся бяда ў тым, што ільназагатоўкі ў такім буйным ільнавадчым раёне як Суражскі выпалі з пад увагі раённых арганізацый. Гэта можна бачыць хоць-б з таго, што ў пастанове райкома ад 8 лістапада, прысвечанай выкананню гаспадарча-палітычных кампаній, аб ільназагатоўках гаворыцца павярхоўна, толькі канстатуецца пагражаючае становішча і на гэтым стаіць кропка.

Можна прывесці цэлы рад фактаў, якія гавораць аб тым, што і непасрэдна ў калгасах ільназагатоўкі расцэньваюцца як другарадная справа.

Замоўна—адзін з буйнейшых ільнаводчых калгасаў у раёне, кажэцца, гэтым летам здаў каля 50 цэнтн. валакна і больш 100 цэнтн. трасты.

Не здала амаль нічога.

— Мы раней выкаваем хлеб і буль бу, а потым уже возьмемся за апрацоўку ільну,—сказаў старшыня калгаса Мойчанка.

У гэтым калгасе яшчэ ляжыць на спеліначы пад снегам каля 25 га трасты. Каля двух га ільну нават не абмалочана. Да апрацоўкі ільну тут не прыступілена. Ні старшыня калгаса Мойчанка, ні яго намеснік Озол аб арганізацыі мяльна-сушыльных пунктаў і не думаюць.

Не лепш справа з апрацоўкай ільну і ў другім буйным ільнаводчым калгасе «Звязда».

Афіцыйна пры калгасе арганізаван мяльна-сушыльны пункт, але толькі афіцыйна, фактычна-ж работа яшчэ не распачата. Не працуе ў калгасе таксама ільнамялка, крыстасаваная да трактара. Аб арганізацыі мяцця і трапання ў калгасе ніхто не клапоціцца.

У гэтым калгасе звыш 4 га ільну яшчэ не абмалочана. Каля 40 га не пастлана са спеліначаў і каля 30 га пастлана з расцілі ў далейшую апрацоўку не пушчана. І не дзіва, што калгасам план здачы трасты выканан толькі на 15 проц., а па ільнавалакну на... 0 проц.

У калгасах, якія прыступілі да апрацоўкі ільну, па якасці зварачаецца зусім мала ўвагі. Так, калгас «Новы шлях» замест таго каб здаць ільнавалакно 10-м нумарам, фактычна здаў 7 цэнтн. ільнавалакна 6-м. Гэта рэзультат дрэннай апрацоўкі.

Старшыня калгаса Паньчанка замест таго каб клапаціцца аб правільнай арганізацыі апрацоўкі ільну, лічыць за лепшае сістэматычна займацца п'янкай разам з сваім брыгадзірам Дзіязавым—сынам царкоўнага старасты.

Аб тым, што не глядзяць за якасцю апрацоўкі ільну гаворыць і такі факт. Сярэдняя гатунковасць ільнавалакна Суражскаму раёну ўстаноўлена № 9. У парадку сустрэчнага раённы арганізацыі ўзялі на сябе абавязак здаць валакна ніжэй 10-м нумарам, фактычна здаў 7 цэнтн. ільнавалакна 6-м. Гэта рэзультат дрэннай апрацоўкі.

У пачатку лістапада на прыкладзе Сеннянскага і інш. раёнаў у Суражы паравшылі скліканць раённую канферэнцыю ўдарнік-трапальшчыц.

Але канферэнцыя, як і трэба было чакаць, сарвалася. Раённыя арганізацыі запомнілі пра адну «дробязь»: «каб скліканць канферэнцыю трапальшчыц, трэба раней арганізаваць апрацоўку ільну, а калі гэта не зрабілі, дык адкуль-жа возьмуцца трапальшчыцы?»

Вывад ясны. Суражскі раён невыпадкова занесены на чорную дошку зрыўшчыкаў ільнапрацоўкі і ільназагатоўкі. Здзіўляе толькі тое, што кіраўніцтва раёна—ні сакратар райкома КП(б)Б Аўдзейчыкаў, ні старшыня райвыканкома Русак не зрабілі ні яко вываду з пастановы цэнтральнай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю.

Брыгада «Звязды»:
А. ЗАРУБЕЖНЫ, С. РАСКІН.

За апрацоўку ільна я атрымала 60 пудоў хлеба

Наш калгас ўжо даўно разлічыўся з дзяржавай як па збожжу, так і па ільнавалакну. На сходах нам расказвалі, што наша валакно прынята 9 і 11 нумарамі. Безумоўна, гэта гонар для нашых калгаснікаў.

Толькі ў калгасе я навучылася добра апрацоўваць ільнавалакно. Зараз мату раўняцца па лепшай трапальшчыцы нашага калгаса Ланецка Ульяне, якая занесена на чырвоную дошку.

Усе калгаснікі ўжо ведаюць слова т. Сталіна, што «жанчына ў калгасе—вялікая сіла». У нашым калгасе мы ўжо маем жаночыя брыгады, масы і добрых калгасніц-ударніц.

Падводзячы вынікі работы за год, магу смела сказаць, што не ў тым год, а праз год я стану заможнай.

За адзін лён я атрымліваю 10 цэнтн. збожжа, 60 руб. грошай, мануфактуры і г. д., апрача выпрацаваных працадзён на калгасным полі.

Такіх выгадаў мы дабіліся дзякуючы сацыябарэнтуру, якое было шчырока разгорнута ў нашым калгасе па мяжы брыгадамі.

Падводзячы вынікі нашай работы, я хочу каб мяне запісалі ва ўдарную брыгаду імя высокага ўраджаю ільну.

Мы з поўнай перамогай сустрэнем з'езд перакладных ільнаводчых калгасаў і ўпэўнены, што наш калгас атрымае месца на гэты з'езд.

Трапальшчыца **ТАРАСЕНКА НАСТА.**
Калгас імя Сталіна, Подгорнае



Сотні кіламетраў непрахадзімых балот, пясоў пакрываюць новыя шасейныя дарогі. На здымку: Адзін з вучасткаў новапабудаванай дарогі.

ТЭХВУЧОБА ЯШЧЭ НЕ МАСАВАЕ З'ЯВІШЧА

32 рабочых і работніцы Барысаўскага камбіната «Баравіна» атрымалі тэхнічнае пасвед. карыстацца сваімі варштатамі. Яны вытрымалі экзамен на «цобра», а некаторыя на вот на «вельмі добра». Тэхвучоба паступова разгортваецца, але трэба адзначыць, што ў гэтай справе ёсць і вялікія недахопы.

Тэхнічнай вучобай на камбінаце ахоплены толькі асобныя брыгады і [illegible] калісаў, пралізаюць у совецкія ўстановы і г. д.

[illegible] тактыку класавы во[illegible] тэхнічных гурткоў [illegible] боку часто заняткі заўсёды зрываюцца. Сакратар парт'ячэйкі т. Фірага і старшыня цэхкома Страдзе не цікавяцца гэтым пытаннем, не дапамагаюць комамольскай ячэйцы [illegible] тэхвучобу.

У аўтаматным цэху рабочых не хапаюцца аўладаннем тэхнікі, між тым гэты цэх з'яўляецца сэрцам заводскай фабрыкі. З-за слабай кваліфікацыі рабочых нарэшце часта бываюць перабоі ў рабоце аўтаматаў і псаванне іх.

Сакратар парт'ячэйкі аўтаматнага цэха тав. Фрумкін і старшыня цэхкома Навіцкая яшчэ нічога не зрабілі для арганізацыі тэхвучобы. На тэхвучобу глядзяць як на дробязную кампанейскую справу. Не лепш адносяцца да гэтай справы і фабком камбіната.

[illegible] чым пашыны зайкучена ідуць над большэвіцкім кіраўніцтвам да заможнага жыцця украінскія калгасы, усё больш выразнага камбайна працуе соцыялістычных здачы норм на значок «ЗОТ». Іншы перы Чабанаў, Яноўскі, Кокар і інш. разу не прыступічалі пры здачы тэхнічнага экзамена.

Мы ўключыліся ў вытворчы паход імя тав. Гікало. У сувязі з гэтым [illegible] ўсіх тэхвучобай рабочых прафесій.

Серафімовіч.

ДА АДКРЫЦЦЯ ДОМА МАСТАКА

З развіццём і ростам нашага соцыялістычнага будаўніцтва, культуры,- соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме, — расце і пашыраецца сістэма совецкага выяўленчага мастацтва БССР. Будуюцца заводы, фабрыкі, ствараюцца тэатры, палацы культуры, мы адначынку. Усё гэта будаўніцтва не абыходзіцца без жывапісі, скульптуры, графікі, яно патрабуе мастацтва, патрабуе афарміленчай працы.

Мастак адыгрывае вялікую ролю ў афарміленні нашага быта, у афарміленні нашых свят, урачыстых пасяджэнняў, масавых дэманстрацый і г. д.

Афарміленчай працай выяўленчае мастацтва ўвайшло ў цела і кроў нашага рэвалюцыйнага грамадзянства і стала значным фактарам, актыўным удзельнікам у пабудове соцыялізма ў нашай краіне.

Пасля пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый, спарыўшся Саюз совецкіх мастакоў БССР, што паскорыла рост і развіццё мастацтва і яго ідэйную перабудову. Аб гэтым сведчыць першая Усебеларуская мастацкая выстаўка, на якой мы мелі рад карцін, якія ўжо гаварылі аб значным ідэйным мастацкім росце нашых мастакоў. Мы мелі там палотны мастака Пашкевіча, у якіх ужо больш мастацка і ідэйна глыбока адлюстравана рэвалюцыйна-пар тызанскі рух на Беларусі ў часы белапольскай акупацыі.

«II з'езд РСДРП» Ахромчыка, «Пад ваенскай пятой» (Заходняя Беларусь) Дастяла, «Кастрычнік на Беларусі» — Грубе і інш.; у гэтых працах мы бачылі ўжо вялікі эрух не толькі ў бок совецкай тэматыкі, але і ў бок аўладання мастацкай тэхнікай, у бок мастацкага майстэрства.

Але самыя вялікія дасягненні на фронце выяўленчага мастацтва мы маем у гэтым годзе, у скульптурных працах на афарміленню нашымі мастакамі Дома ўрада. Мы там маем такія значныя мастацкія творы, як бюсты «Маркс і Энгельс» мастака Керкіна, «Дзяржынскі» мастака Астура, «Чарвяшэўскі» і «Бабель» — Астура, «Бомбе-

ля, у якіх яркі схоплен і адлюстраван рэвалюцыйны рух пролетарыята ў нас і на Захадзе. Усе гэтыя мастацкія працы гавораць аб вялікім эруху ў нашым выяўленчым мастацтве. З гэтых прац асабліва вылучаюцца працы мала дога мастака Астура.

У гэтых творах мастак Астур загаварыў простай, для шырокіх мас зразумелай мовай і простымі сродкамі рэалізма дабіўся максімальнай пластычнасці і выразнасці і паўнаты. Гэтыя творы служаць буйным крокам наперад не толькі ў развіцці мастака Астура, але і ўсяго беларускага выяўленчага мастацтва ў галіне скульптуры.

Але, не гледзячы на значны культурны рост гэтых мастакоў, ёсць і недахопы. На іх творах у значнай ступені адчуваюцца яшчэ ўплывы «адраджэнізма», уплывы класіцызму, якую мастакі выкарыстоўваюць яшчэ не зусім крытычна.

Прыкладам гэтага можа служыць бюст «Мясніцкоў» (у Доме ўрада) мастака Астура, які цалкам зроблен пад Верокіо і ўцяленяе рысы не пролетарыята рэвалюцыянера нашага веку, а абстрагаваныя рысы кандацьцьрыма, вобраз гладыятара. Стварыць вобраз кандацьцьера, паказаць яго воль і сілу было метай мастака Верокіо. У вобразе верокіоскага кандацьцьера выражаліся ідэі і замыслы італьянскай буржуазіі эпохі адраджэння. А калі мы ўспрымаем Верокіо некрытычна, яго стыль, яго манеру творчасці прыстасоўваем да нашых ідэй, да совецкай тэматыкі, дык яны гучаць фальшыва, вялыя глуха і не выклікаюць да сябе прыхільных водгукаў нашага совецкага гледача.

Тут яшчэ мы бачым, што перад нашымі мастакамі ляжаць вялікія труднасці на шляху аўладання і крытычнага выкарыстоўвання культурнай спадчыны мінулых эпох. А таксама яшчэ ляжаць вялікія труднасці перад імі ў галіне аўладання совецкай тэматыкай у поўным сэнсе гэтага слова. Некаторыя з нашых мастакоў яшчэ і да гэтага часу лічаць рэвер совецкім па тэме, па змесце. Трэба сказаць, што у мастацтве сама назва яшчэ не выражае заместа, не выражае ідэі. Змест, ідэйнасць тэмы раскрываецца ў майстэрстве мастака, у яго манеры бачыць і паказваць рэчы, у яго светапогляде. Змест свайго твора мастак раскрывае не назвай, а спецыфічнымі элементамі мастацтва. А гэтыя элементы падбіраюцца, кампануюцца майстрам у адпаведнасці з яго класавым светапоглядам. Адсюль арэзумела, што нашаму мастаку трэба заўсёды клапаціцца аб павышэнні свайго палітычна-культурнага ўзроўню.

Не гледзячы на значны рост нашага выяўленчага мастацтва, наблюдаецца ад ставанне яго ад задач соцыялістычнага будаўніцтва, ад нашага сучаснага грамадскага жыцця. У чым прычыны гэтага адставання? Першая прычына — гэта недастатковая ідэалагічная перабудова нашых старых мастакоў, якія з да гэтага часу нясуць на сабе груз свай то мінулага, груз акадэмізма; не выпрацаванае яшчэ новае прыёмы, жывапісная тэхніка, майстэрства для выражэння новага ідэйнага зместа; вельмі слабая падрыхтоўка нашых маладых мастацкіх кадраў.

Усё гэта ставіць перад намі, перад Саюзам совецкіх мастакоў, і перад совецкай грамадскасцю задачы — ўзмацніць палітычна-выхаваўчую працу сярод мастакоў, падняць мастацка-культурны ўзровень нашага мастака на належную вышыню.

Совецкі ўрад, улічваючы вялікую ролю нашага выяўленчага мастацтва ў соцыялістычным будаўніцтве, ідзе насустрач мастаку, дапамагае выяўленчаму мастацтву падняцца і стаць у першыя шэрагі нашага культурнага будаўніцтва. З гэтай метай 29 лістапада г. г. у Менску адкрываецца Дом мастака, які дасць магчымасць Саюзу совецкіх мастакоў планамерна праводзіць як палітычна-выхаваўчую, так і мастацка-творчую работу сярод мастакоў. З адкрыццём Дома мастака Саюзу совецкіх мастакоў у БССР неабходна разгарнуць шырокую мастацкую работу, разгарнуць шырокія творчыя дыскусіі аб мастацтве, абгаварэнне паасобных выставак, паасобных твораў мастакоў; пастаянць выставкі аб вывучэнні культурнай спадчыны мінулага; на канкрэтным матэрыяле разгарнуць дыскусію на пытаннях соцыялістычнага рэалізма, прыцягнуўшы да гэтага шырокую совецкую грамадскасць, неабходна разгарнуць бязлітасную барацьбу супроць фармалізма і контрэвалюцыйнага нацдэмакратызма, якія яшчэ маюць месца ў нашым выяўленчым мастацтве (Касталанскі, Тарасікаў і інш.). Фармалізм у нашым мастацтве гэта ёсць асаблівасць нацдэмізма, які адмаўляе нашу сучасную совецкую рэчаіснасць у мастацтве.

Моцны ўдар нашай мастацкай крытыкі павінен быць накіраван супроць фармалізма, у нашых умовах асабліва. Бо фармалізм у нашым беларускім мастацтве ёсць скрыты, замаскаваны нацдэмізм. Фармалісты ў нашым мастацтве ставяць сваёй метай ацінаваць мастака, а таксама і гледача ад соцыялістычнага будаўніцтва.

Для таго, каб падняць на высокі ўзровень нашу ідэалагічную барацьбу, класавую пільнасць на фронце выяўленчага мастацтва — трэба ліквідаваць усякую бесправяцыпоўную групаўшчыну.

Пры Доме мастака неабходна сістэматычнае разгортванне мастацкіх, тэматычных выставак, на якіх ставіць сваёй метай паказаць беларускаму рабочаму і калгаснику нашы дасягненні ў соцыялаўніцтве. На гэтых выстаўках не абходна паказаць жыццё, быт рабочых, калгаснікаў СССР. Паказаць жыццё і барацьбу рабочых капіталістычных краін. Пасуль неабходна ахапіць больш усебакова пытанні рэвалюцыйнай барацьбы замежнага пролетарыята.

Нясупынна ўзрастаючыя запатрабаванні шырокіх працоўных мас. усё больш узрастаючы іх культурны ўзровень настойліва дыктуе нам неабходнасць паказа сродкамі выяўленчага мастацтва ўсяго багацця нашай краіны, нашай эпохі, паказа выкарчоўвання старых перажыткаў у свядомасці чалавека і актывізацыі яго, як будаўніка бясклассавага соцыялістычнага грамадства.

Пры адкрыцці Дома мастака Саюз совецкіх мастакоў павінен улічыць вялікія творчыя магчымасці, закладзеныя ў шырокіх масах рабочых і калгаснікаў і паставіць сабе задачай узняць пад свой шырокіх працоўных мас. Саюз совецкіх мастакоў павінен трымаць моцную сувязь з вядомымі самавукамі, юз-рабкорамі і з самадзейнымі мастацкімі арганізацыямі (Заводам і інш.).

Пастаўленая совецкай уладай і партыяй перад совецкімі мастакамі БССР задача стварэння вялікага мастацтва большэвізма, стварэння манумэнтальных мастацкіх твораў, адпавядаючых вялікаму соцыялістычнаму будаўніцтву, патрабуе ад мастакоў аўладання тэхнікай выяўленчага мастацтва, яго сродкамі: малюнкамі, фарбамі, кампазіцыямі прыёмамі, тэхналогіяй матэрыялаў; аўладання марксіцка-ленінскай тэорыяй. У сувязі з гэтым пры Доме мастака неабходна стварэнне мастацкапрактычных і тэарытычных курткоў і студый на аўладанню майстэрствам, павучэнню асноў юз-мастацтва і гуртко ў па марксіцка-ленінскаму перавыхаванню кадраў мастакоў як старых, так і маладых.

Трэба адзначыць, што да гэтага часу ў галіне выяўленчага мастацтва нічога не зроблена кіраўніцтвам інстытута ЛІМ пры БелАН. Неабходна паставіць пытанне перад Акадэміяй навук аб стварэнні пры інстытуце ЛіМ секцыі выяўленчага мастацтва, якая непасрэдна займалася-б навукова-тэарытычнай працай у галіне выяўленчага мастацтва і такім чынам дапамагала-б ідэалагічнаму і культурнаму росту мастакоў БССР.

У метах падняцця культурнага ўзроўню нашых мастакоў, у метах крытычнага аўладання мастакамі спадчынай мінулага адначасова з адкрыццём Дома мастака неабходна паставіць пытанне перад Галоўмастацтвам БССР (якое да гэтага часу нічога не зрабіла па паляпшэнню кваліфікацыі мастакоў) аб адкрыцці ў Менску мастацкага музея, які з'явіцца таксама ўстановай па палітычна-культурнаму выхаванню працоўных мас. Для мастакоў ён дасць магчымасць на канкрэтным матэрыяле знаёміцца пытаннямі вытворчага парадку, пытаннямі вывучэння культурнай спадчыны мінулага.

Саюз совецкіх мастакоў БССР павінен стаць балевым саюзам. Пад кі

ФРАНКА-ГЕРМАНСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

ВОДГУКІ ГЕРМАНСКАЙ ПРЭСЫ

БЕРЛІН, 27 лістапада. (БЕЛТА).

Увесь друк, уникаючы, аднак, асобных каментарыяў, падрабязна прыводзіць заграніччны водгукі на паведамленне Гітлера французскім паслом Понсэ. «Лакаль анцэйгер» падкрэсліваё, што, калі-б французскі, англійскі, італьянскі друк зрабіў на аснове гэтай першай гутаркі далёка ідучыя дапушчэнні, дык гэта было-б надта заўчасна.

— Несумненна, трэба дапускаць,—піша газета,—што ў часе гутаркі гаварылася аб пытаннях разбраення і аб саарскім пытанні. Аднак, гэта магло праходзіць толькі ў той форме, у якой Гітлер займаўся гэтымі праблемамі ў сваіх публічных выступленнях.

ФРАНЦУЗСКІЯ ЎМОВЫ

ПАРЫЖ.

«Тан» раіць устрымацца ад паспяховых заключэнняў на новаму гутаркі Гітлера з Понсэ. Паводле вестак газеты, гутарка мела чыста інфармацыйны характар. Задача Понсэ заключалася ў тым, каб даведацца, якія канкрэтна прапановы высоўвае Гітлер. Гэта гутарка з'яўляецца, паводле слоў газеты, «прадмовай да сапраўдных перагавораў».

Паводле слоў «Тан», Понсэ згадзіўся мець гутарку з Гітлерам па наступных меркаваннях:

1) Францыя ніколі не адмаўлялася весці перагаворы з якой-бы там ні было краінай; 2) польска-германская згода «палячае» франка-германскія перагаворы, паколькі польска-германскія супярэчнасці «да гэтага часу складалі галоўную перашкоду» для ўсякай франка-германскай згоды; 3) у Жэневе была прынята пастанова аб неабходнасці двухбаковых перагавораў, якія аблягчылі заключэнне кан венцыі па разбраенню; 4) Англія спрыяе франка-германскаму збліжэнню».

«Тан» падкрэсліваё, што ў перагаворах з Германіяй Францыя не намерана пайсці ні на якія ахвяры ў галіне сувязяй са сваімі саюзнікамі і з прыяцельскімі краінамі.

ЛЕЙПЦЫГСКІ СУДОВЫ ФАРС

НА СЦЭНЕ—ЧАРГОВЫ ПРАВАКАТАР

ГАСТРОЛЬ ПАЛІЦЭЙСКАГА ГЕЛЛЕРА

ЛЕЙПЦЫГ, 28 лістапада. (БЕЛТА).

27-га лістапада суд прыступіў да разгляду «палітычнага комплекса».

«Палітычная частка» працэса пачынаецца допытам чыноўніка крымінальнага дэпартамента пры паліцэй-прэзідыуме ў Берліне Гезнера. Голлер робіць даклад, які цягнуўся з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня. Гэта — па сутнасці прамова пракурора. У сваім дакладзе, мэта якога «даказаць наяўнасць падрыхтоўкі ўзброенага паўстання і антыдзяржаўную дзейнасць компартыі», Геллер спасылаецца, з аднаго боку, на розныя дакументы выканкома Камінтэрна, ЦК германскай компартыі, акруговых канференцый, партыйнага друку і г. д., а з другога боку — на паведамленне правінцыяльнай паліцыі і сакрэтных паліцэйскіх данясенні.

У частцы, якая грунтуецца на партыйных дакументах і выказваннях паасобных кіраўнікоў компартыі, ён на сутнасці пацвярджае раней даныя на судзе лекатарыямі комуністычнымі актыстамі паказанні аб палітычнай лініі партыі ў гэты перыяд.

Геллер не прыводзіць ні аднаго дакумента, які-б сведчыў, што компартыя Германіі разглядала сітуацыю як рэвалюцыйную і высоўвала лозунг узброенага паўстання. У прыведзеным ім цыркуляры берлінскага камітэта компартыі ад 9-га лютага гаворыцца, што ў Германіі няма рэвалюцыйнай сітуацыі.

Другая частка даклада Геллера, мэта якой «даказаць» падрыхтоўку компартыяй узброенага паўстання, базуецца на паліцэйскіх данясеннях і матэрыялах тайнай паліцыі. Геллер лічыць, што цэнтр цяжару ў рабоце компартыі ляжаў у нелегальнай дзейнасці. Ён сцвярджае, што ў радзе месц нібыта былі арганізаваны спецыяльныя нелегальныя курсы, на якіх вывучалася ваенная справа.

Далей Геллер прыведзіць рад сакрэтных данясенняў тайных паліцэйскіх агентаў аб нелегальных сходах, у прыватнасці аб выступленнях Торглера і г. д.

У сувязі з гэтым **ТОРГЛЕР** два разы заяўляе, што не прысутнічаў на сходах, пра якія гаворыцца ў данясеннях паліцэйскіх агентаў, і значыць не гаворыў таго, што яму прыпісваецца.

Адвакат Зек заяўляе, што Геллер дае паказанні не на аснове сваіх назіраванняў, а на аснове матэрыялаў, атрыманых з трэціх рук. Ён выказвае абазрэнне, што гэта выклічэ неабходнасць прыцягнення новых сведак і вазьме дра цэс. «Я,—гаворыць ён,—абараняю чалавека Торглера і таму гатоў адмовіцца ад выклікання сведак, у процівагу сведкам абвінавачання на гэтаму пытанню. Але Торглер можа запрабаваць выклікаць такіх сведак. Тады можа ўзнікнуць вялікая палітычная дыскусія і працэс зацягнецца».

Пракурор Вернер лічыць, што паведамленне Геллера з'яўляецца чыста паказальнымі сведкі» і што ў выпадку неабходнасці можна будзе выклікаць тага-ояго з даверанных асоб, даўных паведамленні паліцыі.

Пасля гэтай заявы выступае **ДЗІМІТРАЎ**. Ён заяўляе, што нічога яе мае супроць палітычнай дыскусіі, як і супроць таго, каб былі апублікаваны ў друку і паведамленні на працэсе ўсе прыведзімыя Геллерам матэрыялы, але пры гэтым павінна быць строга размежавана, што адносіцца да дакумента компартыі і што з'яўляецца паліцэйскімі данясеннямі.

Суд тут-жа робіць нараду для прыняцця рашэння па гэтаму пытанню і прыходзіць да вывада, што Геллер можа даваць паведамленні не толькі на падставе ўласных назіраванняў, але і на падставе вестак з трэціх рук.

Пытанне аб каштоўнасці гэтых паведамленняў павінна быць вырашана судом.

Потым Геллер робіць рад паведамленняў на аснове матэрыялаў тайнай паліцыі, прыводзячы, у прыватнасці, данясенні ў берлінскі паліцэй-прэзідыум аб тым, што ў розных месцах нібыта рыхтуецца захват электрычных станцый і іншых жыццёва-важных прадпрыемстваў. Геллер гаворыць, што ў тойжа перыяд берлінскай паліцыяй быў арыштаван нейкі комуністычны актывіст, у якога нібыта была знойдзена заметка аб тым, як разбураць жыццёва-важныя прадпрыемствы і захапляць стратэгічна важныя пункты, нежыталт казарм і г. д.

Дзімітраў задае Геллеру пытанне: «Калі гэта было?» Геллер: «Гэта было часткова ў лютым да пажара рэйхстага, а часткова пасля пажара рэйхстага». Потым Геллер сцвярджае, быццам у радзе месц былі арганізаваны тэрарыстычныя групы, а таксама збіраліся выбуховыя матэрыялы, зброя і праводзілася работа сярод паліцыі, рэйхсвера і г. д. Паведамленне Геллера ва многіх выпадках і па зместу і на падставе спасылае з тымі публікацыямі, якія да гэтага былі зробы па выдаванні нацыянал-соцыялістамі кнізе Эрта «Узброенае паўстанне».

БЛАКАДА ФУЦЗЯНА

ШАНХАЙ, 27 лістапада. (БЕЛТА).

Паводле слоў амерыканскай газеты «Інтэрнэшнл пост», на граніцы правінцыі Чэкіянг пакіраваны з раёнаў Бейпіна і Ханькоу 4 дывізіі. Фрахтуюцца суды для перавозкі войск у Ніпак і Вэньчжоу (парты ў правінцыі Чжэнзян).

Нанкінскія самалёты па-ранейшаму працягваюць рокатнасцыроўку ў правінцыі Фуцзянь, скідаючы лістоўкі. Блакада правінцыі Фуцзянь з мора пачалася. Да берагоў Фуцзяна адпраўлены ваенныя судны з Нанкіна і Шанхая.

Тым часам кантонскія ўлады ўмацоўваюць пазіцыі на граніцы правінцыі Гуанцун-Фуцзянь.

Нанкінскі ўрад загадаў арыштаваць Чэн Мін-сю, Лі Ці-сіна і Еўгенія Чэна. У кітайскай частцы Шанхая абвешчана ваеннае становішча. Паводле слоў японскіх газет, у Шанхаі арыштаваны два генералы войск шанхайскага гарнізона па абвінавачанні ў цэнтрымаўнні сувязі з рухам у Фуцзяне. Паводле слоў агенцтва Рэйтэр, у Фуцзяне ствараецца камітэт «па палепшанні жыцця сялян і рабочых».

ПАЗІЦЫЯ КОНСУЛЬСКАГА КОРПУСА

ШАНХАЙ, 27 лістапада. (БЕЛТА).

Як паведамляе «Сімбун рэнто», у Фучжоу (правінцыя Фуцзянь) нарада консульскага корпуса пад старшынствам японскага консула пастанавіла не ўмешвацца ў меры фуцзянскага ўрада, накіраваныя да захопа даходу мясцовых мытніц і да іншых ненармальнасцей пакуль не ўзнікне пагроза для замежных інтарэсаў.

НАНКІНСКІ ЎРАД АДНАЎЛЯЕ СУВЯЗЬ З МАНЧЖОУ-ГО

ШАНХАЙ, (БЕЛТА).

Паводле слоў кітайскіх газет, з Шанхайгуаня пачалася эвакуацыя японскіх войск у Цзіньчжоу.

Чакаюць, што ў бліжэйшыя дні Шанхайгуань будзе перадан кітайскім паліцэйскім уладам.

Згодна паведамлення агенцтва «Гомін», Вэй Цзэн-цей заявіў, што нанкінскі ўрад разглядае пытанне аб адпаўленні чытуначнай, поштовай і мытнай сувязі з Манчжоу-го.

Японафільская «Шанхай таймс» указвае, што становішча ў Паўночным Кітаі «значна палепшаецца ў карэўнасці са становішчам у Паўднёвым Кітаі». Паводле слоў газеты, японскі пасланнік у Кітаі Арыёсі выказвае Хуан-фу, які «аддае ўсе сілы палітычным справам Паўночнага Кітая». Газета запэўняе, што ў хуткім часе будуць вырашаны ўсе праблемы япона-кітайскіх адносін.

ВАКОЛ СТВАРЭННЯ ГАБІНЕТА ШОТАНА

ПАРЫЖ, 27 лістапада. (БЕЛТА).

Перад стварэннем габінета Шотана адбываліся дзённія перагаворы Шотана з неосоцыялістамі—з аднаго боку і групай Фландэна—з другога. Аднак, гэтыя перагаворы не прывялі да станоўчых результатаў. Шотан прапанаваў неосоцыялістам Марэлю і Лафуну увайсці ва ўрад. Але Рэспадэль параіў ім па гэты раз адмовіцца ад прапановы Шотана.

У палітычных колах тлумачаць адмаўленне неосоцыялістаў тым, што перш чым увайсці ў той ці іншы ўрад, неосоцыялісты хочуць канчаткова аформіць сваю партыю, каб забяспечыць свае выбарныя пазіцыі.

Устрымане групы Фландэна ад удзела ў габінеце, паводле слоў «Матэн», тлумачыцца неадаволенням гэтай групы тым, што Шотан прапанаваў таксама неосоцыялістам увайсці ў габінет.

***

ПАРЫЖ, 27 лістапада. (БЕЛТА).

Нарада бюро левабуржуазных фракцый палаты дэпутатаў, уключаючы бюро «радыкальна-левай», пастанавіла стварыць так званую «пастаянную дэлегацыю левых».

Згодна выступленага паведамлення, задача гэтай «дэлегацыі»—падтрымаць усякае міністэрства, якое адкрыта апіраецца на левыя групы і забяспечвае фінансавае аздараўленне і захаванне асноўных прынцыпаў дэмакратычных картый.

ПАТРАБАВАННІ АМЕРЫКАНСКІХ ФЕРМЕРАЎ

Н'Ю-ЙОРК, (БЕЛТА).

Канферэнцыя фермераў, скліканая рэвалюцыйным, «нацыянальным фермерскім камітэтам дзейнасці» ў Чыкаго, закрылася. У прынятых рэзалюцыях канферэнцыя асуджае ўрадавую праграму эміцыяння пасеваў і павышэння раздробных цэн, пратэстуе супроць армаўлення ў выдачы крэдытаў значнелым фермам, асуджае меры, накіраваныя супроць забастовачнага руху рабочых і фермераў і заклікае фермераў да барацьбы разам з рабочымі ў абарону сваіх інтарэсаў.

50.000 ГАРНЯКОЎ ВЫШЛІ НА ВУЛІЦЫ

МАСАВЫЯ РЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 27 лістапада. (БЕЛТА).

Як паведамляе «Юманітэ», ва многіх месцах паўночнай Францыі адбыліся дэманстрацыі, арганізаваныя рэфарматамі. Дзякуючы ўдзелу ў іх рэвалюцыйных прафсаюзаў, дэманстрацыі ператварыліся ў дэманстрацыі адзінага фронта. У іх прымала ўдзел 50 тыс. вучлякопаў і беспрацоўных.

У Валанс'ене ў дэманстрацыі прымала ўдзел 6 тыс. рабочых. Тут, як і ў іншых месцах, адбыліся жорсткія сутычкі з паліцыяй, арыштаваўшай комуністычнага дэпутата Дэвеза. Дэлегацыя ў складзе прадстаўнікоў вугляпкопаў, прадстаўнікоў унітарных (рэвалюцыйных) прафсаюзаў і беспрацоўных патрабавала і дабілася вызвалення Дэвеза.

Чэбаксары--абкому УсеКП(б), Соўнаркому і Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту Чувашскай АССР

Масква—рэдакцыі „Известий ЦИК СССР и ВЦИК"

Стаячая на рубяжы з капіталістычным Захадам, фарпост Совецкага Саюза—Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка, побач з вялізарнейшымі дасягненнямі па ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, дасягнутымі пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе ЦК на чале з тав. Сталіным—дабілася буйнейшых поспехаў у справе барацьбы з цяжкай спадчынай царызма—векавым бездарожжам БССР за гады совецкай улады пры гітаніцкай дапамозе Саюза ССР пабудавала нямат дарог.

Аднак, як у самым будаўніцтве шосейных і грунтавых дарог, так і ў дасягнутых экспляатацыі нова-пабудаваных і існуючых дарог ёсць рад недахопаў.

Вітаючы ініцыятыву партыйных і совецкіх арганізацый Чувашыі, **БССР прымае выклік і ўключаецца ў стабор ніцтва на будаўніцтва культурнай совецкай дарогі, за лепшую арганізацыю і выкарыстанне працоўнага ўдзела насельніцтва на выкананне плана ў дарожнага будаўніцтва 1934 г. і на лепшую арганізацыю экспляатацыі існуючых дарог.** Для абмеркавання і заключэння дагавора соцспаборніцтва высылаем делегацыю ў Чуваншю.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.
Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

ПРЫЕЗД ПІСЬМЕННІКАЎ РСФСР У МЕНСК

Сёння прыязджае ў Менск брыгада арткамітэта Саюза совецкіх пісьменнікаў РСФСР і СССР—адна з брыгад, створаных па ініцыятыве **А. М. Горкага** для вывучэння нацыянальных літаратур народаў Совецкага Саюза. Прыезд не звязан з падрыхтоўкай да кернага ўсесаюзнага з'езда совецкіх пісьменнікаў.

У складзе брыгады каля 10 пісьменнікаў, крытыкаў, літаратуразнаўцаў, у тым ліку т. т. **Бруно Ясенскі, Вл. Бахмецьеў, Н. Огнёў** і інш. Брыгаду ўспачалае адказны сакратар арткамітэта ССП РСФСР і СССР т. **Кірпоцін.**

Брыгада прабудзе ў БССР некалькі дзён, на працягу якіх будзе арганізован рад літаратурных вечароў і выступленняў. Маскоўскія таварышы паведаюць нашы культурныя ўстановы—БелАН, універсітэцкі гарадок, дзяржаўную бібліятэку, а таксама буйнейшыя фабрыкі і заводы як у Менску, так і на перыферыі.

ДАКЛАД МЕНСКАГА ГАРСОВЕТА НА ПРЭЗІДЫУМЕ ЦВК СССР

МАСКВА, 28 лістапада. (БЕЛТА).

27-га лістапада адбылося пад старшынствам т. **Калініна М. І.** чарговае пасяджэнне прэзідыума ЦВК СССР.

На пасяджэнні прэзідыума ЦВК СССР быў заслуханы даклад т. **Карэнёўскага** аб рабоце Менскага гарадскога совета.

У спрочках па дакладу т. Карэнёўскага выступілі т. т. Чарвякоў, Епукідзе, Медведзеў і інш.

Для выпрацоўкі рэзалюцыі па дакладу т. Карэнёўскага прэзідыум ЦВК вылучыў спецыяльную камісію.

ПРАБЛЕМА ВОЛГА-КАСПІЙСКАГА БАСЕЙНА

ЛЕНІНГРАД. (БЕЛТА).

На сесіі Акадэміі навук з двухгадзённым дакладам аб праблеме соцыялістычнай рэканструкцыі Волга-Каспійскага басейна выступіў акадэмікРкыкжачоўскі.

Шырокі даклад аб тэхнічнай схеме рэканструкцыі Волгі зрабіў праф. Розенкампф, які падрабязна спыніўся на адной з асноўных задач рэканструкцыі—пабудове электрастанцыі Сталінград—Саратаў—вольскія пасёлкі станцыі—Самара — Казань — Горкі —Масква. Як паведаміў дакладчык, рэканструкцыя Волгі на працягу 3-х бліжэйшых пяцігодак патрабуе 16,5 млрд. руб. Гэтыя расходы акупяцца ў 10-12 год.

27-га лістапада на агульным сходзе акадэмікаў выступілі з дакладамі праф. Чапыгін і акадэмік Тулайкоў.

„ЧЫРВОНАЯ КНІГА ВЫСОКІХ УРАДЖАЯЎ"

ЛЕНІНГРАД, 27 лістапада. (БЕЛТА).

У «Чырвоную кнігу высокіх ураджаяў» занесены першыя 27 ленінскіх калгасаў вобласці.

Некаторыя калгасы перавысілі нават сярэднюю ўраджайнасць, запраек таваную на канец другой пяцігодкі. Дасягнуты і нават перавышаны ўраджаі перадавых гаспадарак заходня-эўрапейскіх краін.

Калгас «Пуповічы» сабраў з га 21,8 цэнтнера азімага жыта, у два разы перавысіўшы сярэднюю ўраджайнасць па вобласці. Калгас «Труд дорог» сабраў з га 213 цэнтнераў бульбы—у 2¼ разы больш чым сярэдняя абласны ўраджай. Калгас «Верный путь к социализму» сабраў з гектара 23,5 цэнтнераў азімай пшаніцы.

Ужо 800 калгасаў вобласці размеркавалі сабе даходы. Калгаснікі атрымліваюць збожжа ў 2-3 разы больш, чым у мінулым годзе.

ПЕРАЛЁТ АМЕРЫКАНСКІХ ЛЁТНІКАЎ Н'Ю-ЙОРК—МАСКВА

МАСКВА, 27 лістапада. (БЕЛТА).

Атрымана паведамленне з Вашынгтона аб маючым быць пералёце амерыканскіх лётнікаў **Патрыджа, Сонно ра і Пінча** па маршруту Н'ю-Йорк—Берынгскія астравы—Азорскія астравы—Берлін—Масква.

На самалёце будуць пасланы ўзоры амерыканскіх тавараў для выстаўкі ў Маскве. Назад амерыканскія лётнікі возьмуць з сабой совецкія тавары для выстаўкі ў Амерыцы. Аэраплан, на якім робіцца пералёт, 18-месны біплан з маторам «Амерыкен-хорнет».

УЗОРНА ЗАВЯРШЫЦЬ АПОШНІ ЭТАП УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСА НА ЛЕПШЫ СЕЛЬСОВЕТ

(На радыё-пераклічцы).

Усесаюзны конкурс на лепшы па рабоце сельскі совет уступіў у апошні этап. Завяршэнне ўсіх с.-г. работ завяршае і ўсесаюзны конкурс. Пасяховае правядзенне сельска-гаспадарчых кампаній з'яўляецца сапраўды лепшым паказальнікам, які характарызуе работу кожнага ў класовку сельсовета. Толькі той сельсовет можа быць прызнан лепшым па рабоце, і прэтэндаваць на першынства ў соцспаборніцтве, які добра выконвае ўсе сельска-гаспадарчыя кампаніі, які актывізаваў секцыі і дэпутацкія групы і ўцягнуў у іх непасрэдную работу шырокія масы калгаснікаў і працоўных адпаасобнікаў.

Задачам завяршэння апошняга этапа ўсесаюзнага конкурса на лепшы па рабоце сельскі совет і была прысвечана радыё-пераклічка, якая адбылася 25 лістапада.

***

18 гадзін. Ля мікрафона т. т. **Чарвякоў, Пыжыкаў, Бенек, Хацкевіч, Конік, Марусевіч** і інш.

Тав. Пыжыкаў коратка кажа:

— Дакладчыкі з месц абавязаны паведаміць, якіх зрухаў у сваёй рабоце дабіўся сельсовет за час правядзення конкурса. Як разгорнута работа секцый і дэпутацкіх груп. Як дапаматалі сельсоветам раённыя арганізацыі і друк. Як кіравалі конкурсам партыйныя ячэйкі і райкомы.

Першым дакладвае **Новікаў** — старшыня Высачанскага сельсовета, Лёзненскага раёна.

— Наш сельсовет, — гаворыць тав. Новікаў, — у гэтым годзе лепш справіўся з выкананнем усіх с.-г. кампаній. Ва ўсіх калгасах працуюць дэпутацкія групы, актыўна працуюць секцыі сельсовета.

Па дакладу як быццам усё добра. Сельсовет, як лепшы ў раёне, узяльнічае ў радыёпераклічцы. І ўсё-ж па справе гэта не так. Ільназагатоўкі выкананы толькі на 50 проц. Размеркаванне ўраджаю не пайшло далей тэхнічнай праграмоўкі. Калгаснікі яшчэ не ведаюць вынікаў сваёй работы. Падрыхтоўчай работы да адзінага совецкага дня не праведзена, хаця ўказанні аб гэтым сельсовет атрымаў 4-5 дзён таму назад.

Тав. **Сакалоўскі** — старшыня Кішчына-Слабодскага сельсовета, Барысаўскага раёна, рапартуе аб тым, што сельсовет збожжазагатоўкі выканаў на 100 проц., бульбакастаўкі — на 95 проц., малако — на 94 проц., ільна семя — 98 проц. Страхавыя і насенныя фонды ссыпаны на 100 проц.

Аб астатніх участках работы сельсовета тав. Сакалоўскі не ўпамінае. І толькі адказваючы на канкрэтныя запытанні т. т. **Чарвякова, Пыжыкава, Бенека** і інш., ён вымушан быў прызнацца, што ў рабоце сельсовета яшчэ не ўсё добра, ільназагатоўкі выкананы толькі на 40 проц., размеркаванне ўраджаю па двух калгасах яшчэ не зроблена. Ніякай падрыхтоўчай работы да адзінага совецкага дня не праведзена. Масавая работа сельсовета настаўлена неадэкватна. Ва ўсім сельсавеце працуе больш-менш задавальняюча толькі адна дэпутацкая група. Да гэтага дня ў калгасах не арганізавана ніводнай касы ўзаемадапамогі.

Інфармацыю старшыні Мазырскага РВК тав. **Жогава** шкіп як агульнай і зусім павярхоўнай нельга назваць. Ён не прывёў ні аднаго факта, ні адной лічбы, якая-б не выклікала сумнення. У прыватнасці т. Жогаў, нікольі не саромячыся, заявіў:

У нас па калгасах не ўсё добра з грубымі кармамі.

Гэта заява не магла не выклікаць зацікаўленасці з боку кіруючых работнікаў. Наркамзем тав. **Бенек** тутжа задае сустрэчнае пытанне:

— Колькі не хапае?

— Каля 80 проц.

— У якіх калгасах і якіх кармоў?

— Мы гэта пытанне, бачыце, яшчэ не падагулялі, — адказвае т. Жогаў, — таму больш дасканала я паведаміць не маю магчымасці.

І так на кожнае пытанне ён адказвае: «Не падагулялі... няма дакладных вестак... зараз гэтым пытаннем займаемся» і г. д.

З усёй інфармацыі ясна толькі адно, што тав. Жогаў на радыёпераклічку папаў зусім выпадкова. Ён да яе зусім не рыхтаваўся, таксама як не рыхтаваліся і ўсе сельскія советы Мазырскага раёна. Апрача тав. Жогава на радыё-пераклічку ніхто не з'явіўся. Яны, бачыце, усе заняты. Ім няма часу.

Зусім іншае ўражанне зрабіў даклад старшыні Аршанскага РВК тав. **Уласевіча.** З першых-жа слоў дакладчыка стала ясна, што ўсесаюзны конкурс на лепшы па рабоце сельсовет з'яўляўся неад'емнай часткай работы раённых кіруючых арганізацый і ўсёй пролетарскай грамадскасці раёна.

Было скліканае 6 нарад старшынь сельсоветаў, абследавана пастаноўка масавай работы ў 8 сельскіх советах, 21 лістапада праведзена спецыяльная нарада па масавай рабоце, на якой былі падведзены папярэднія вынікі ўсесаюзнага конкурса і намечаны задачы пасяховага яго завяршэння.

На радыёпераклічцы выступілі з кароткімі прамовамі Наркамфін тав. **Хацкевіч**, НКЗ т. **Бенек**, старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза і БССР т. **Чарвякоў** і інш.

НКФ т. **Хацкевіч** у сваёй прамове спыніўся на задачах сельскіх советаў у барацьбе за пасяховае выкананне фінансавага плана. Тав. **Бенек** завастрыў увагу раёнаў і сельсоветаў на пытаннях ільназагатовак, ссыпкі страхавых і насенных фондаў, размеркавання ўраджаю, догляду і захавання жывёлы і пашавай сімы, а таксама рамонта с.-г. інвентара. Пры гэтым тав. Бенек асабліва падкрэсліў неабходнасць правільнага захавання насенных і страхавых фондаў, паколькі ў асобных раёнах ёсць факты гарачэння ссыпанага збожжа, што можа выклікаць псаванне апошняга.

Тав. **Конік** спыніўся на масавай рабоце сельсоветаў.

— Конкурс павінен стаць, — гаворыць тав. Конік, — пераломным у справе работы секцый і дэпутацкіх груп. Гэтага пакуль што яшчэ няма. Работа секцый і дэпутацкіх груп не настаўлена на належную вышыню. РКК не забяспечылі належнага кіраўніцтва работай секцый, у выніку чаго яны бяздзейнічаюць. У Лёзненскім раёне ў 24 сельсоветах працуюць толькі 3 секцыі РСІ.

Радыёпераклічка скончылася выступленнем тав. **Чарвякова.**

Тав. Чарвякоў у сваёй прамове адзначыў, як нецалкупчальны факт, тое, што рад раёнаў і да сёпешняга дня не ўключыўся ва ўсесаюзны конкурс па лепшы па рабоце сельсовет і зусім не займаюцца перабудовай работы сельсоветаў. Між тым раёны, якія ў часе весняной сяўбы адставалі па ўсіх с.-г. кампаніях, уключыўшыся ў конкурс, ліквідавалі гэтае адставанне. Тав. Чарвякоў прыводзіць у прыклад Аршанскі раён, які адставаў па ўсіх с.-г. кампаніях вясной, а зараз ідзе ў ліку перадавых. Падкрэсліўшы слабую работу як цэнтральных, так і раённых газет у справе асвятлення хода конкурса, тав. Чарвякоў у заключэнне паставіў рад канкрэтных задач па перабудове масавай работы і закантролю ўсіх сельска-гаспадарчых кампаній з тым, каб пасяхова завяршыць апошні этап усесаюзнага конкурса на лепшы па рабоце сельсовет. **Р-ч.**

Мастацтва БССР

Бюсты Карла Маркса, работы скульптара Керзіна і Бабефа — работы Азгура — выстаўленыя ў Доме ўрада.

Эстафета абароны

29 лістапада па горадзе Менску будзе праведзена эстафета абароны-паказ вайсковай тэхнікі, прысвечаная ўсебеларускаму комсамольска-моладзёжнаму зліту ўдарнікаў абароны.

Эстафетай будуць дастаўлены рапарты ўсебеларускаму зліту аб поспехах баявой і фізічнай падрыхтоўкі часцей гарнізона і палка ДПУ.

Фініш эстафеты 29 лістапада а 5 гадзіне ўвечары на Плошчы Волі.

На фініш эстафеты на пляц Волі ўваходзяць па сваіх маніфестах: члены ЦК КП(б)Б, ЦКК, ГК ЛКСМБ, ЦВК БССР, СНК БССР, ЦСПСБ, МГК КП(б)Б, гарком ГКК, гарком ЛКСМБ, гарсовет, гар. прафсаюз, ВСФК БССР, бюро ФК ЦСПСБ і МГСФК.

Астатнія праходзяць па спецыяльных прапусках, якія выдаюцца ў ВСФК БССР.

Уваход на пляц Волі спыняецца ў 5 гадз. 45 мін.

ЦК ЛКСМБ.
ВСФК БССР.
МГСФК.

Паведамленне

29 лістапада г. г., у 5 г. дня, у памяшканні ЦК КП(б)Б (пакой 104, паверх 5) культпроп ЦК КП(б)Б сумесна з культпропам ГК КП(б)Б скліча нараду па пытанню станоўчага марксіста-ленінскай вучобы на прадпрыемствах і ўстановах г. Менска.

На нараду выклікаюцца з дакладамі сакратары і культпропы наступных парткалектываў і парт'ячэек г. Менска: заводаў «Комунар», «Большевік», абутк. ф-кі імя Кагановіча, хлебазавода, завода «Лампачці Ілліча», ф-кі імя Крупскай, імя 8-сакавіка, цэнтральні № 1-3, 2-4, совецкіх устаноў, яч. ЦК Наркамфіна, Наркамзема, Наркамлеса, Наркамсавгаса, Наркамсвяты, ДВВ, ЦСПС, персаналына прымаючы ўдзел у слядзянні гэтых парткалектываў і парт'ячэек т. т. Любін, Ошэраў, Ліпкін, Поцаў, Ціхаў, Фрал («Звязда»), Штырмэн («Рабочы»), Б («Аксцябр»).

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІН

ДЗЯРЖАЎНЫ ГУСЯЙСКІ ТЭАТР БССР
(вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813)
1-га снежня
РЭКРУТ
Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі Б. Ф. РАФАЛЬ НАГА.
Пачатак у 8 гадз. вечара.

Беларускі Дзяржаўны тэатр Оперы і Балета (па ляшканне БДТ—1)
Мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор—заслужаны артыст рэспублікі тав. Гітгарц І. А.
29 і 30 лістапада ОПЕРА
„ЯЎГЕНІ АНЕГІН"
муз ЧАЙКОЎСКАГА
Пастаноўка рэж. ОЛЬГІ БАРЫСЕВІЧ.
Дырыжор Н. С. БАЛАЗОЎСКІ.
Пачатак роўна ў 8 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Гукавы мастацкі фільм ГАЙЛЬ МОСКАЎ (Нічай жыве Масква)
КІНО „Інтэрнацыянал" — Замежны мастацкі фільм МІХАЭЛЬ Драма ў 7 частках
КІНО „Пролетарый" — Замежны мастацкі фільм Цыганка Марцына (індыйская танцаўшчыца)
Дзіцячы гукавы кіно-тэатр КАРМЕЛЮК
Кіно СПАРТАК — Ад 29 лістапада Выдаецца мастацкі фільм ДА ЗАЎТРА Драма ў 7 частках У праграме—саюз хроніка № 26 Каса—з 4-х гадзін.

Менгарком КП(б)Б скліча 29 лістапада г. г. а 7-й г. увечары ў вялікай зале Дома камасветы
агульна-гарадскую НАРАДУ ПАРТАКТЫВА
У парадку дня даклад дэлегацыі парторгаў аб вопытах партмасавай работы на прадпрыемствах Масквы
На нараду выклікаюцца ўсе сакратары парткалектываў, сакратары цэх ячэек, групарторгі, групагітатары ўсіх вытворчых, совецкіх і вузаўскіх партарганізацый
Білеты атрымаць 28-га і 29-га лістапада ў ГК КП(б)Б (пакой № 45)
Менгарком КП(б)Б

1 снежня 1933 года ў Менску роўна ў 5 гадзін вечара ў клубе БКС
СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА
ўсіх старшынь райспажыўсаюзаў, райупаўпаважаных па закупцы збожжа і дырэктароў межрайбаз
па пытанню аб прадстаячай закупцы збожжа.
Яўка ўсіх абавязкова
ПРЭЗІДЫУМ БКС

Цэнтральнае праўленне саюза працмастацтва сумесна з Наркамасветы склікаюць 30 лістапада а 12 гадз. дня ў памяшканні Беларускага Дзяржаўнага тэатра.
ГАРАДСКІ СХОД ПРАЦАЎНІКОЎ МАСТАЦТВА
на які запрашаюцца пісьменнікі і гурткі самадзейнага мастацтва.
ПАРАДАК ДНЯ
Даклад нам. наркома асветы т. Дунца аб задачах і ходзе падрыхтоўкі да Усебела рускай нарады работнікаў мастацка-відовішчных прадпрыемстваў.
Яўка ўсіх членаў саюза працмастацтва абавязкова і без спазнення.
Прэзідыум ЦП працмастацтва.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—21-352, нам. адказнага рэдактара—25-188, сакратарыят—21-350. СЕКТАРЫ: партыйнага будаўніцтва—21-353, прамысловы—21-354, совецкага будаўніцтва—21-354, дарожнага будаўніцтва—21-354, соц. земляробства—21-355, нацыянальна-культурнага будаўніцтва—21-355, замежнай інфармацыі—25-189, лістоў рабочых і калгаснікаў—21-356. Загадчык выдавецтва—21-358. Выпускаючы—21-357.

Друкарня «Звязды»